ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 43 (4295)
Нядзеля, 21 лютага 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Завяршыць ліквідацыю няпісьменнасьці І. ФЭЛЬДМАН—За выразнае палітычнае сельска-гаспадарчага крэдыту. В. САМУЦІН — За ўсямернае разгортваньне і паскарэньне таваразвароту (3 стар.).

За захаваньне і падрыхтоўку каня да вясны павінны адказваць пастаянныя брыгады даглядчыкаў. Адмасобны сэктар выканаў плян ільназагатовак усяго на 38,1 проц. Папярэдзіць разгрузку (на 1-ай БелДРЭС імя Сталіна) (1 стар.).

Ачыстка калгасаў ад кулакоў, бязьлітасная барацьба з правымі і «левымі» апартуністамі забясьпечыць новыя посьпехі ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў (2 стар.).

Арганізуем сацспаборніцтва заводаў. Правільная расстаноўка і скарыстаньне рабочай сілы і механізмаў—асноўныя ўмовы выкананьня плану дарбудаўніцтва. Стара-дарослыя арганізацыі супакоіліся на... 47,8 проц. выкананьня збожжазагатоўчага плану (3 стар.).

Японскія войскі ў Шанхаі падрыхтаваліся да атакі. Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі (4 стар.).

Завяршыць ліквідацыю няпісьменнасьці

Сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, сусьветна-гістарычная перамога краіны пралетарскай дыктатуры ў справе пабудовы сацыялізму забясьпечылі бурны, небывалы ні ў адной капіталістычнай дзяржаве, рост культурнага ўзроўню працоўных мас Савецкага Саюзу.

«У адносінах пісьменнасьці старая Расія стояла на самым апошнім месцы сярод эўрапэйскіх краін. Цяпер, перагнаўшы па колькасьці студэнтаў у ВНУ Францыю, Англію, Амэрыку, мы і па пісьменнасьці ўжо перагналі такія краіны, як Балгарыя, Гішпанія, Польшча, Літва. Нам мала засталося, каб дагнаць Францыю, а ў бліжэйшы час дагонім Германію, першую па колькасьці пісьменных краіну» («Праўда»). Да рэвалюцыі процант пісьменнага насельніцтва старой Расіі не перавышаў 25. А ў 1931 годзе Савецкі Саюз меў 70 проц. пісьменнага насельніцтва.

Савецкая Беларусь — у мінулым адна з прычэпачаных акраін рамантаўскай імпэрыі пасьля Кастрычніка, да XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі прыйшла з гігантскімі запаволаньнямі ў гаспадарчым і нацыянальна-культурным будаўніцтве. Савецкая Беларусь першая з усіх савецкіх рэспублік узяла ўсеагульнае навучаньне. КП(б)Б і ўрадам пастаўлена галоўная задача — да 1 мая 1932 году **ператварыць БССР у краіну сусьцільнай пісьменнасьці.**

За нарэшце нявялікі час нам удалося ліквідаваць няпісьменнасьць сярод 800 тысяч чалавек дарослага працоўнага насельніцтва. Цяпер школамі ахоплена 96 проц. усіх дзяцей школьнага ўзросту. Агульная пісьменнасьць у краіне ўзьнята да 80 проц. супроць 31,8 проц. у 1920 годзе і 16 проц. — да Кастрычніка.

Такі бурны рост пісьменнасьці, такое шырокае разгортваньне барацьбы за культурны рост і сацыялістычнае перавыхаваньне працоўных мас магчымы толькі пры дыктатуры пралетарыяту, магчымы толькі ў выніку няўхільнага і паслядоўнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі і ленінскай нацыянальнай палітыкі.

ЦК ня раз указваў, што рашэньні партыйныя арганізацыі вясуць поўную адказнасьць за своечасовую і поўную ліквідацыю няпісьменнасьці.

Паасобныя раённыя і гарадзкія камітэты партыі адносяцца з усёй рэвалюцыйнай дзелавітасьцю да гэтага простага ўказаньня ЦК і рассчитуюць шырокую, штурмавую барацьбу за пісьменнасьць. Гомэль, Віцебск, Менск, Полацак, Рагачоў, Лагойск — перадавікі вялікай работы па перавыхаваньні БССР у краіну сусьцільнай пісьменнасьці. Яны дабіліся стопроцантнага ахопу ліквідуктамі няпісьменных.

Цалы рад прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і сельсаветаў яшчэ да 14-й гадавіны Кастрычніка дабіліся сацыяльнай пісьменнасьці. Заваяваны рашаючыя перамогі, грандыёзныя посьпехі за ўзьнядзці культурнага ўзроўню краіны. «Працоўныя цягнуцца да ведаў, таму што яны неабходны ім для перамогі. Дзесяць дзесятых працоўных мас зразумелі, што веды зьяўляюцца зброяй у іх барацьбе за вызваленьне, што іх няўдачы тлумачацца слабой асьветай і што цяпер ад іх саміх залежыць зрабіць асьвету сапраўды даступнай усім» — казаў Уладзімер Ільіч яшчэ ў 1918 годзе, на першым усерасійскім зьезьдзе па асьвеце. Гігантамі тэмпамі расьце пісьменнасьць.

На гэтым аркім фоне дасягненьняў робіцца агульнай бязьдзейнасьць і поўнае ігнараваньне балвой і першачарговай задачы партыі па ліквідацыі няпісьменнасьці з боку цэлага раду раёнаў, раённых і цэнтральных арганізацый і ўстаноў.

Вось яны, тыя раёны, што падмянілі сакавёкам вялікую, арганізаваную, бальшавіцкую работу па выкарчоўваньні барбарскай спадчыны фэадальна-памешчыцкай Расіі — рэшткаў няпісьменнасьці.

На 1 лютага бягучага году ў Магілёўскім раёне было ахоплена навучаньнем выяўленых няпісьменных дарослых толькі 54 проц., Чавускім — 54 проц., Капыльскім — 63 проц., Чырвонапольскім — 68 проц., Шклоўскім — 66 проц., Пятрыкоўскім — 67 проц., Стара-Дарожскім — 67 проц., Быхаўскім — 68 проц., Рэчыцкім — 69 проц.

Сёньняшнае становішча справы ў пералічаных раёнах абсалютна незадавальняючае і ставіць над простую пагрозу выкананьне ў тэрмін пастаўленай партыяй задачы.

Тым больш, што за апошні час выяўлен рад фактаў ні з чым непараўнальнага «очковтирательства». Без шумных чынаў з Пленчанскага раёну і палітасьветы давалі ў цэнтр самыя руковыя весткі, а на месцах развальваліся ліквпункты, або і ўсім не арганізоўваліся. У Горках да таго перастарались, што ахапілі навучаньнем... 102 проц. няпісьменных і 178 проц. малапісьменных. Прыправерцы-ж выявілася, што толькі каля 40 проц. няпісьменных і малапісьменных больш менш рэгулярна наведваюць ліквпункты.

Віна за такое ганебнае апушчаньне пралетарскай грамадзкасьці ў значнай ступені кладзецца на мясцовыя партыйныя арганізацыі.

Згодна пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б, зараз праводзіцца дзяднік генэральнай праверкі работы па ліквідацыі няпісьменнасьці. Палітычная задача дзядніка — ажыўіць справу, узьняць усю пралетарскую грамадзкасьць, уключыць усе вагары, разьвіць такія тэмпы работы, каб цалкам завяршыць ліквідацыю няпісьменнасьці да 1 мая.

Дзядзнік генэральнай праверкі — гэта дружнае ўключэньне ў атэйны паток культармейцаў усіх органаў НКА і прафсаюзаў, усіх камсамольскіх і грамадзкіх арганізацый, пад кіраўніцтвам партарганізацый, да канца работы, да поўнай перамогі. Бо нельга-ж далей цярпець такога становішча, калі, напрыклад, рад камсамольскіх арганізацый Беларусі ў апошні час дэмабілізаваліся з калёны байцоў за пісьменнасьць.

Абавязацельства — даць шпагатічнаму фронту падмацаваньне з 800 камсамольцаў, а таксама і цалы рад другіх задач па ўсеагульным навучаньні і ліквідацыі няпісьменнасьці — камсамолам яшчэ ня выканана.

Трэба бяз усякіх адкладваньняў наладзіць метадычнае і апэрацыйнае кіраўніцтва работай культармейцаў, абнаружыць іх пашанай і дапамогай. За гэту работу абавязаны ўзяцца цэнтральны і раённы друк.

Толькі два месяцы і некалькі дзён адлучаюць нас ад 1-га мая. Гарадзкія і раённыя партыйныя арганізацыі, усе партыйныя ячэйкі, асабліва адсталых раёнаў, павінны забясьпечыць поўнае і своечасовае выкананьне заданьня партыі. Трэба ажыўіць таварыскі «П. Н.», узьняць гарадзкія пікэтныя ячэйкі, мабілізаваць усіх пісьменных, заклікаць тых настаўнікаў, якія яшчэ не праводзяць ліквідацыі няпісьменнасьці.

«Усямернае паскараньне ажыцьцяўленьня ўсеагульнай пісьменнасьці насельніцтва, хутчэйшае ўцягваньне ўсёй справы тэхнічнай асьветы і ўзмоцненае матар'яльнае падрыманьне ударнай разьвіцьця навукі ў СССР — такавы ближэйшыя задачы, якія прадстаўляюць асноўную частку агульнай задачы набудовы сацыялізму ў нашай краіне» (з рэзалюцыі XVII усесаюзнай партыйнай канфэрэнцыі).

Саміх няпісьменных трэба прыцягваць да больш актыўнай барацьбы за ўсеагульнае навучаньне.

«Няма такіх цытадэляў, якія-бы бальшавікі не маглі ўзяць». Да 1-га мая павінны быць узяты апошнія подступы, апошнія вышыні ў ліквідацыі няпісьменнасьці. Да 1-га мая БССР павінна рапартаваць усяму Савецкаму Саюзу аб сваіх новых сусьветна-гістарычных перамогах. Такая задача.

За захаваньне і падрыхтоўку каня да вясны— павінны адказваць пастаянныя брыгады даглядчыкаў

Захаваць конскую цягавую сілу

Засеяць ня менш 2.850 тыс. га— вось баявая праграма трэцяй бальшавіцкай вясны. 70 проц. гэтай праграмы прыпадае на конскую цягавую сілу. Адсюль зусім зразумела, што захаваньне і падрыхтоўка конскай цягавай сілы зьяўляецца адной з умоў пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы.

Матар'ялы, якія мы сёньня друкуем, сьвядчаць, што рад раёнаў і калгасаў, рыхтуючыся да вясны, зусім забываюць пра каня, праходзяць міма шматлікіх фактаў шкодніцтва, а часамі проста барбарскіх, адносін да конскай цягавай сілы.

Дагэтуль яшчэ ня ліквідавана агітацыйная абязьлічка ў догляде і скарыстаньні коней. Толькі з-за абязьлічкі ў радзе калгасаў Уваровіцкага раёну коні зусім зморены. Абязьлічка прыняла да таго, што ў калгасе «Іскра», Рагачоўскага раёну, 50 проц. конскага парку выйшла са строю, а ў калгасе «Чырвоны прымежнік», Полацкага раёну, лепшыя коні заежджаны.

15 сакавіка — апошні тэрмін стварэньня браніраваных фуражных фондаў на час палявых работ. Але весткі, якія мы маем, сьведчаць аб пагражаючым становішчы на гэтым адказьнейшым вучастку падрыхтоўкі да сяўбы. Па рэспубліцы заданьне па стварэньні браніраваных фуражных фондаў выканана: па грубых кармох на 5,4 проц., па канцэнтраваных — на 1,3 проц. З прычыны адсутнасьці ўсякага кантролю за выдаткаваньнем кармоў, у радзе калгасаў мы нагледаем факты разбазарваньня і расьцягваньня кармоў.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР аб арганізацыі масавага аміяду ўтрыманьня коней і стварэньня фуражных фондаў павінна стаць баявой праграмай дзеяньняў кожнага цяўну, кожнага саўгасу і калгасу для кароннага перамогу ў падрыхтоўцы конскай цягавай сілы да вясны. Палітычнае догляду каня, выгучэньне для гэтай мэты пастаянных брыгад, эканомнае выдаткаваньне кармоў і стварэньне фуражных фондаў на час палявых работ становіцца зараз першачарговай задачай кожнага саўгасу і калгасу. Усе ўнутраныя кармовыя рэсурсы павінны быць узяты пад строгі вучот. Выдаткаваньне іх трэба паставіць пад кантроль шырокіх калгасных мас. Трэба дабіцца, каб не пазьней 15 сакавіка ў кожным калгасе быў вызначаны браніраваны фуражны фонд.

Адказнасьць за захаваньне конскай цягавай сілы ў калгасе трэба ўскласьці на пастаянную брыгаду даглядчыкаў і на тых калгасьнікаў, якія працуюць з коньмі.

Падрыхтоўка каня да вясны і стварэньне фуражных фондаў патрабуе змуштаваньня калгаснага актыву для рашучага адпору кулацкім уплывам на адсталыя групы калгасьнікаў, для перамаганьня супраціўленьня кулацкіх элемэнтаў вызначэньню браніраваных фуражных фондаў, для перамаганьня кулацка - рвацкіх тэндэнцый у калгасах.

Аб ходзе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

СНК БССР адзначае, што ход і тэмпы падрыхтоўкі да веснавой сяўбы не забясьпечваюць выкананьня задач, пакладзеных у пастанове ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі (газ. «Савецкая Беларусь» за 1932 г. № 9).

Асноўнымі недахопамі ў падрыхтоўцы да правядзеньня веснавой сяўбы зьяўляюцца:

а) Да гэтага часу планы сяўбы не даведзены да саўгасаў, калгасаў і ў парадку самаабавязацельства да бяднякоў-серадняцкіх гаспадарак, у радзе раёнаў кулацкім гаспадаркам ня вызначаны цьвёрдыя заданьні.

б) Плян засыпкі насеньня выканан толькі на 29,1 проц., загатоўкі насеньня—на 11 проц., ачысткі насеньня—на 12,6 проц. У радзе раёнаў цьвёрдыя заданьні па ачыстцы кулацкімі гаспадаркамі насеньня не спатканы.

в) Дрэнна арганізавана захаваньне насеньных фондаў, у выніку чаго ў радзе раёнаў насеньня псуецца.

г) Незадавальняюча ідзе рамонт сельска-гаспадарчых машын і інвэнтару, асабліва трактараў.

д) Належным чынам не скарыстоўваецца сапраўдная дарога для вывазкі гною, завозу вапны і мінэральнага ўгнаеньня.

е) Дрэнна пастаўлена ажыцьцяўленьне справаздачнасьці аб ходзе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

ж) Слаба мабілізуецца грамадзкасьць на выкананьне задач веснавой сяўбы.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць Народны Камісарыят земляробства, Белкалгаспцэнтр, с.-г. трусты і аб'яднаньні і белдзяржпляннае Трактарацэнтру, раённыя выканаўчыя камітэты, гарадзкія і сельскія саветы скончыць даследаваньне плянаў да саўгасаў, калгасаў і адпасобнікаў да 1 сакавіка.

2. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам, сельскім саветам, Белкалгаспцэнтру і беларускаму аддзяленню Трактарацэнтру скончыць засыпку насеньных і страхавых фондаў і 100 проц. ачыстку насеньня да 15 сакавіка, а таксама ўстанавіць у саўгасах і калгасах штодзённы кантроль за захаваньнем насеньня, арганізаваўшы агляд усёй забуртаванай бульбы і, калі будзе выяўлена загніваньне, неадкладна перабраць яе для пазьнейшага дзелейшага выкананьня.

3. Прапанаваць Белхлебазьбыўсаюзу, Белмалакмалыводсаюзу, Белсадгародсаюзу, Насенкалгассаюзу, беларускай канторы Насеньводаб'яднаньня і раённым выканаўчым камітэтам ужыць самыя рашучыя захады для ўзмоцненьня загатовак насеньня з тым, каб планы былі выкананы да 15 сакавіка і скончыць абмалот насеньня ў лепшы тэрмін.

4. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты і Белкалгаспцэнтр зараз-жа пачаць арганізацыю міжкалгаснай (у межах раёну) узаемадапамогі насеньнем.

5. Абавязаць Белсельгаспраб, упаўнаважанага Саюзнафты, Белкаасаюз і сыстэмы с.-г. кааперацыі да выхаду ў поле выканаць плян запасу машын і 100 проц. іх рэалізацыю, забясьпечыўшы адначасова трактарны парк запаснымі часткамі, гаручым і змазачным матар'ялам, скарыстаўшы поўнасьцю сапраўную дарогу для завозу іх у глыбінныя пункты з тым, каб гаручых і змазачных матар'ялаў было ня менш месячнага запасу.

6. Прапанаваць беларускаму аддзяленьню Мінучаснеўня, Белкалгаспцэнтру і раённым выканаўчым камітэтам масавымальна скарыстаць сапраўную дарогу для завозу вапны і мінэральнага ўгнаеньня непасрэдна ў саўгасы і калгасы і вывазу гною на поле.

7. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам у дзядны тэрмін арганізаваць масавы агляд у саўгасах і калгасах якасьці ўтрыманьня коней і скончыць стварэньне браніраваных фуражных фондаў да 15 сакавіка.

8. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты, гарадзкія саветы, с.г. трусты і аб'яднаньні падрыхтаваць навосьні ўстаноўленых форм і ў выключаных тэрміны Народнаму камісарыяту земляробства апэрацыйную справаздачнасьць.

9. Лічыць патрэбным, каб цэнтральны і раённы друк больш шырока асьвятляў ход падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР—М. Галадзед.
Нам. кіраўніка справаў Савету Народных Камісараў і Оргаправа Савету БССР—Ф. Сулкоўскі.
17 лютага 1932 г.
г. Менск.
№ 73.

Пад кантроль саўгаснай грамадзкасьці

НАРОЎЛЯ. Зусім недапушчальнае становішча са скарыстаньнем цягавай сілы ў саўгасе «Дзярновічы». З 20 коняў, якія меліся ў саўгасе, 5 стала з прычыны дрэннага догляду і непамернай нагрузкі. З купленых тыдня двух коней на віно нам. дырэктара саўгасу Шульжыка адзін уже выбыў са строю.

Далей такое становішча недапушчальна. Падрыхтоўку конскага парку да вясны трэба ўзяць пад суровы кантроль усяго калектыву саўгасу.

Філоненка.

Да адказнасьці

РАГАЧОЎ. У паасобных калгасах раёну назіраецца ляўзы нядбайнага конскай цягавай сілы.

У калгасе «Іскра» коні, якія бяруцца калгасьнікамі для сваіх патрэб, трымаюцца цэлымі днямі без харчу і належнага догляду. У калгасе «Чырвоны зямляроб» стайні зусім не ачышчаюцца, коні стаяць па калена ў бруднае. Дрэнны догляд прыбіў да таго, што з 30 коняў прецаздольных — засталося толькі 15.

Праўленьні калгасаў і паасобныя калгасьнікі, якія разбазарваюць жывую цягавую сілу, падбайна адносяцца да догляду за коньмі, павінны быць прыцягнуты да судовай адказнасьці. (БЕЛТА).

У калгасе імя Сталіна коні падрыхтаваны да вясны

ВІЦЕБСК. Калгас імя Сталіна сапраўды па-бальшавіцку рыхтуе каня да бальшавіцкай вясны.

Коні размешчаны ў некалькіх пры стасаваных стайнях, якія добра ацеплены. Утпуры стайняў узорная чыстота, гной своечасова выграбаецца. Для забесьпячэньня коняй поўнацэнным калгасьнікі скарыстаў ільляную кастру.

Кожны конь мае свае нарэшце і поўны камплект збруі. Коні разьбіты на групы, за кожную з іх разам са збруяй адказваюць пэўныя даглядчыкі.

У калгасе створан браніраваны фуражны фонд з жыпошыны і сена, які поўнасьцю забясьпечвае патрэбы ў часе веснавых работ.

Асабліва прыкладным у гэтых адносінах зьяўляецца адзяленьне «Вабаль». Ім забраніравана 133 цэнт. жыпошыны.

Конскі парк калгасу імя Сталіна ўжо гатоў да бальшавіцкай вясны. Усе калгасы БССР павінны рыхтаваць цягавую сілу так, як рыхтуе яе калгас імя Сталіна.

Старасьценка, Блінаў.

Вылучыць пастаянную брыгаду

ПОЛАЦАК (Наш кар.) У калгасе «Чырвоны прымежнік» догляд за коньмі не арганізаваны. Дагэтуль ня вылучана пастаянная брыгада даглядчыкаў. Кармы з прычыны адсутнасьці ўсякага кантролю са іх расходаваньнем разбазарваюцца. Часты выпадкі пашкоджаньня коняй. Большасьць з іх схудала і страціла свае прадпрэцэдольнасьць.

Праўленьне калгасу зусім не рэагуе на злачынныя адносіны да захаваньня цягавай сілы.

Варавацкі.

АДНААСОБНЫ СЭКТАР ВЫКАНАЎ ПЛЯН ІЛЬНАЗАГАТОВАК УСЯГО НА 38,1 ПРОЦ.

Усямернае разгортваньне масавай работы, рашучая барацьба з кулацтвам, —зарука павышэньня тэмпаў загатовак

Недапушчальнае адставаньне

Адпасобны сэктар найбольш адстае ў выкананьні пляну ільназагатовак. Так, на 16 лютага калгасы БССР здалі 77,9 проц. плану, а па адпасобным сэктары загатоўлена ўсяго 38,1 проц.

Па радзе раёнаў (Сеньненскі, Полацкі, Горацкі) процант выкананьня пляну адпасобным сэктарам значна ніжэйшы.

Недапушчальна слаба праходзіць спагнаньне цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак. Па Сеньненскім раёне спагнана ўсяго 50,7 проц., па Асіпавіцкім раёне — 37,3 проц. Па некаторых сельсаветах Асіпавіцкага раёну процант выкананьня цьвёрдых заданьняў складае ад 8 да 16.

Падазаныя лічбы сьведчаць аб тым, што паасобныя парт'ячэйкі і сельсаветы па апартуністычнаму недаацэньваюць адпасобнага сэктару ў ільназагатоўках і замест арганізацыі загатовак, рашучай барацьбы з асіпаньнем і разбазарваньнем ільну спадзяюцца на самацёк.

Слабае разгортваньне арганізацыйна-масавай работы сярод адпасобнікаў — бядняковаў і серадняковаў, слабы націск на кулака прывялі да таго, што ў радзе сельсаветаў ільназагатоўкі фактычна згарнуліся.

Трэба безадкладна пакончыць з адставаньнем адпасобнага сэктару. Неабходна прыпусьціць кулацка-заможныя гаспадаркі спагнасова і поўнасьцю выкаўваць цьвёрдыя заданьні, а зрыўшчыкаў ільназагатовак прыцягваць да суровай адказнасьці.

Матар'ялы Дрысенскага раёну, якія мы сёньня друкуем, гавораць аб тым, што па тых сельсаветах, дзе ільназагатоўкі пастаўлены ў цэнтр увагі і вакол іх разгорнута сапраўдная масавая работа, дасягнуты бліскучыя вынікі.

Неабходна дабіцца такога павышэньня тэмпаў ільназагатовак. Бязьлітасна знагалчыся з правай практыкай і «лявацкімі» загібамі, разгортваючы масавую работу сярод калгасьнікаў і бядняковаў і серадняковаў — адпасобнікаў, арганізуючы буксір перадавікоў адстаючым, трэба ліквідаваць адставаньне адпасобнага сэктару ў бліжэйшыя-ж дні.

Больш рашуча дабівацца перамогі

ПОЛАЦАК.

Полацкі раён на 11 лютага плян ільназагатовак выканаў толькі на 43,5 проц. Апошнія пяцідзёўкі далі зусім нязначны прырост — ад 1 да 3 проц. Такія марудныя тэмпы ні ў якай меры не забясьпечаюць своечасовага выкананьня гадавога пляну.

Асабліва адстаюць сельсаветы — Поўліцкі, які выканаў гадавы плян на 19,1 проц., Бужаўскі—20,8 проц., Бабяйніцкі—20,9 проц., Васільеўскі —21 проц. і інш.

Сельскія саветы, партыйныя ячэйкі і загатоўныя пункты аслабілі барацьбу за лён. Апартуністамі папаўняецца дурная аб «нерэальнасьці» пляну.

Паасобныя члены Гомельскага сельсавету, падпалі пад кулацкі ўплыў. Так, член гэтага сельсавету Бурак Аўпрэй трымае шчыльную сувязь з кулацкім элемэнтам і на прыпае мер да спагнаньня цьвёрдых заданьняў. Па яго пункце па цьвёрдых заданьнях спагнана толькі 5 проц.

Па Вароніцкім сельсавеце плян выкананы на 26,1 проц. Ні сельсавет, ні ячэйка, ні сельпартгрупа не прымаюць ніякіх мер да таго, каб на асновe разгортванньня шырокай масава-палітычнай работы поўнасьцю выканаць заданьне.

Малаістінянскі сельсавет плян выканаў на 25 проц. і загатоўку спыніў у той час, як ільну ў сельсавеце ёсьць выстарчальная колькасьць для поўнага выкананьня гадавога пляну. Ільнавалакно разбазарваецца.

Райком партыі, райвыканком і газэта «Чырвоная Полаччына» за апошні час апускаюць цяжкую ўвагу ільназагатоўкам. У сельсаветы і калгасы накіраваны рад адказных работнікаў. Патрэбна, каб на барацьбу за поўнае выкананьне пляну ільназагатовак быў мабілізаваны кожны партыец і камсамолец кожны калгасьнік, бядняк і серадняк—адпасобнік.

Ч. П.

Кулацка-рвацкім тэндэнцыям не даецца адпору

СЯННО. (БЕЛТА).

Плян ільназагатовак па Сеньненскім раёне выкананы на 53,5 проц.

У некаторых калгасах — «Аболь», «Накасёлкі»—маюць месца кулацка-рвацкія тэндэнцыі. Лён разбазараецца. З боку раду парт'ячэек і сельсаветаў не вядзецца рашучай барацьбы з гэтымі шкодніцкімі тэндэнцыямі.

Асабліва адстае адпасобны сэктар, які выканаў плян ільназагатовак усяго на 29 проц. Поўную бязьдзейнасьць праяўляе Ульянаўскі сельсавет, які здаў усяго 7 проц. пляну. Такі-ж малюнак па Застадольскім і Навасельскім сельсаветах, дзе плян загатовак ільну па адпасобным сэктары рэалізаван толькі на 10-14 проц.

Цьвёрдыя заданьні спагнаны на 50,7 проц. Застадольскі, Расьляніскі, Сідарэнкі і Навасельскі сельсаветы не ацэньваюць на кулацка-заможныя гаспадаркі і не прымушаюць іх поўнасьцю і своечасова выканаць цьвёрдыя заданьні.

Вопыт лепшых—тым, што адстаюць

ДРЫСА.

НА 16 ЛЮТАГА ДРЫСЕНСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ПЛЯН ІЛЬНАЗАГАТОВАК НА 81,5 ПРОЦ. МНОГІЯ КАЛГАСЫ З ГОНАРАМ ВЫКАНАЛІ СВОЮ АБАВЯЗАК ПА ЗДАЧЫ ТАВАРНАЙ ПРАДУКЦЫІ ДЗЯРЖАВЕ У ЛІЧЫ ПЕРАДАВЫХ — КАЛГАСЫ: «БАРАЦЬБІТ», ЯКІ ЗДАЎ 192 ПРОЦ. ПЛЯНУ, «ПІТЛАНДАР» — 180 ПРОЦ., ІМЯ БУДЗЕННАГА — 164 ПРОЦ., «ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫЯ» — 160,6 ПРОЦ., «БАЛЬШАВІК» — 144 ПРОЦ., ІМЯ КРУПСКАЯ — 116 ПРОЦ.

ПЕРАВЫКАНАЛІ ПЛЯН ВЕСКІ: ВУЛЫ — 223 ПРОЦ., ЛУКІШЧА — 136 ПРОЦ., ЛАЦКОЎШЧЫНА — 136,2 ПРОЦ., НАВІЧКІ — 120 ПРОЦ., ІМЯ ЛІТВІНАВА — 113,1 ПРОЦ., ЛАЗАВІКІ — 106 ПРОЦ.

АЛЕ Ў ТОЙ-ЖА ЧАС ЁСЬЦЬ РАД КАЛГАСАЎ І ВЁСАК, ЯКІЯ ГАНЕБНА ПЯГНУЦЦА Ў ХВАСЬЦЕ І ГЭТЫМ САМЫМ ЗРЫВАЮЦЬ СВАЕЧАСОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РАВНАГА ПЛЯНУ. ТАК, КАЛГАС ІМЯ РОЗКАВА ЗДАЎ УСЯГО 11,5 ПРОЦ. ПЛЯНУ, «ЯСНАЯ ПАЛЯНА» — 16,7 ПРОЦ., «ЗЕЛЯНАЎШЧЫНА» — 35,7 ПРОЦ. АДСТАЮЦЬ ТАКСАМА ВЁСКІ МУРДЗІНАВА, КРАВАЛАВА, САКАЛОЎШЧЫНА.

ПЕРАДАВЫЯ КАЛГАСЫ І СЕЛЬСАВЕТЫ, НАПЯРАКОР АПАРТУНІСТЫЧНЫМ РАЗВАЖАНЬНЯМ АБ НЕРЭАЛЬНАСЬЦІ ПЛЯНАЎ, ВЯТОЛЬКІ ВЫКАНАЛІ, АЛЕ І ПЕРАВЫКАНАЛІ ПЛЯНЫ. ГЭТА ДАСЯГНУТА ПА ВЫВІКУ ПРАВІЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПЕРАМАГАЮЧЫХ ПЛЯНАВАЛАЧА І ШЫРОКАГА РАЗГОРТВАНЬНЯ МАСАВАЙ РАБОТЫ СЯРОД КАЛГАСЬНІКАЎ І АДПАСОБНІКАЎ.

НА 1-ай БЕЛДРЭС імя СТАЛІНА

ПАПЯРЭДЗІЦЬ РАЗГРУЗКУ!

Дзяжурныя інжынэры адзначаюць у сваіх добрую работу станцыі. 16-га лютага інжынэр тав. Бурыкоўцоў запісаў: «На працягу зьмены гарэньне на першым і трэцім катлах часамі было вельмі добрае, так што нафта ў паказаньня катлы не падавалася».

Станцыя працуе нармальна, навялічваючы з кожным днём выраб электраэнэргіі.

12 лютага—131.000 кілёват - гадзін, 13-га — 151.000, 14-га — 168.500, 15-га — 171.500, 16-га— 174.000, 17-га 176.000.

Адная, супакойваецца яшчэ рана. На станцыі ёсьць столькі нескароў, перарабак, бесгаспадарчасьці, столькі выкідаў папялёскі, залічэнных адносін па сваіх абавязкаў з боку раду работнікаў, што ў любую мінуту можа пайтрэсьціца старое.

Узяць хаця-б сартаваньне торфу і правільнае харчаваньне топак—асноўныя прадпасылкі нармальнай работы станцыі. Сэктар апалу БелДРЭС усе яшчэ падбайна адносіцца да забесьпячэньня выразнай пастаноўкі гэтай справы. 16-га лютага трэцяя зьмена рабочых эскаваты і сартэйчыкі на нагрузцы не атрымалі графікаў сваёй работы. Выявілася, што сэктар апалу забыў падрыхтаваць і раздаць гэтыя графікі. Удзень на быў выдзелены вучастак нагрузкі для чацвёртай зьмены, як былі расстаўлены ўказальныя шчыты аб гатоўнасьці. Сэктар апалу спадзяваўся на павозку торфу з раёнаў. Але вагоны з торфам спазьніліся, таму прыйшлося грузіць не рассартаваны торф і якасьць яго пагоршылася пасьля пагрузкі ў вагоны. Вразумела, што вынікчыцца якасьці торфу і падачы паражняка, ёсьць «цыклёпчар», без дазволу якога нарэшце ня рушацца з месца. Калі вагонтыкі цалкам вінават сэктар апалу на чале з інжынэрам Кажабрэцкім, які ўсё яшчэ недаацэньвае рашаючага значэньня арганізаванага і пляннага ударнаваньня топак апалам.

Агідныя непарадкі пануюць яшчэ па торфападачы, дзе прастой дасягнулі выключных памераў, але спякага зьмаганьня з гэтым не вялося. І тут стаўка выключна на самацёк. Тры вучаткі — нагрузка, транспарт і эстакада ў рабоце яких павінна быць максымальная ўвязка, працуюць кожны сам па сабе. Таму часта, па не калькі раз у дзень здараецца што нагружаныя вагонткі з торфам чакаюць прыходу паравозаў, прызны чакаюць паравозы, а эстакада стаіць, бо няма торфу.

13 лютага эстакада стояла на працяку сутак 15 гадз. 27 хвілін, 14 лютага —9 гадз. 12 хвілін, 15-га — 5 гадз. 27 хв., 16-га— 5 гадз. 19 хв. Замест нормы ў 96 вагонтак у зьмену і рэальных 150-160 вагонтак, эстакада ў сувязі з поўнымі прастоямі ўскладнае ў сярэднім 88 вагонтак, зьніжаючы гэту жэбу ў паасобныя зьмены да 57, у той час, як для нармальнай работы 3-х катлоў трэба мінімум 105-110 вагонтак у зьмену. Асабліва ў апошнія дні станцыя працуе амаль з пустымі бункерамі, што пагражае ня толькі зьвосам халоднага паветра ў топкі праз пустыя шахты, але і поўным спыненьнем работы.

Асноўная прычына гэтых аліпасьцей — бюракратызацыя абслугоўваньня падачкі торфу вузкакалейнымі паравозамі. На такім маленькім чыгуначным вучастку, дзе ёсьць усяго 2 паравозы і кожны з іх робіць «стандартныя» рэйсы па вагонаў торфу і падачы паражняка, ёсьць «цыклёпчар», без дазволу якога нарэшце ня рушацца з месца. Калі вагонткі з торфам гатовы-па адпраўцы, або неабходна забраць паражняк, трэба вазьць у цяню і прасіць дыспэтчара прыслаць паравоз. Пакуль дыспэтчар адпае распаражняк, пакуль машыніст сарвецца на паравоз і падыходзіць да вагонтак, праходзіць шмат часу. Як бывае нельга ўстанавіць функцыі гэтых 2-х паравозаў на ўсю зьмену адразу надаючы кажэ імі работу: аднаму даручыць падачу паражняка, другому— дастаўку гружаных вагонтак. Зьмена дыспэтчара Аніона (машыністы Шварц і Варонін) якая ўкінула такі мэтад работы, адразу адбіліся лепшых паказальнікаў станцыі за зьмену, 122 вагонткі. Іншыя зьмены павінны зрабіць тое-ж самае, арганізаваўшы камік сабой сацсаборніцтва на падачу большай колькасьці вагонтак.

Ня мала віны за прастоі эстакады падае і на сэктар апалу, які ня можа забясьпечыць патрэбную колькасьць рабочых на нагрузцы. Замест 35-40 чалавек на работу выходзіць 20-25 чалавек. З прагульшчыкамі цяжкай барацьбы ніхто не вядзе. Прымацаваныя да брыгад грузчыкаў для культмасавай работы члены партыі Слуцкі, Азарэнка, Лонскі і Кузьнецоў нічога ня робяць. Пастанова сходы членаў (удзелегіі аб выпуску і ў казарме грузчыкаў насьценнай газэты ня выканана. Няма нават чырвонай і чорнай дошак, аб якіх гаворыць ужо 3 тыдні.

* * *

Коротка з гэтых трох прычын, аб якіх мы гаварылі вышэй, можа сарвацца работа станцыі. Кіраўніцтва станцыі павінна прыняць самыя энергічныя меры, каб не дапусьціць сапраўдных ганебных старонак у гісторыі 1-й БелДРЭС.

Брыгада «Зьвязды»: Праўдзін, Кіпер.

„Разьвіць узмоцненую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў“ (ЦК УсеКП(б)

Ачысткай калгасаў ад кулакоў, бязьлітаснай барацьбой з правымі і „левымі“ апартуністамі

ЗАБЯСЬПЕЧЫМ НОВЫЯ ПОСЬПЕХІ Ў АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ

Больш клясавай пільнасьці!

Новыя посьпехі ў галіне рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, арганізацыйна - гаспадарчае умацаваньне калгасаў, у пасьляховым правядзеньні веснавой сяўбы КПб)Б забясьпечыць толькі ў бязьлітаснай барацьбе з рэшткамі капіталістычных элемэнтаў, з кулацтвам, якое ліквідуецца як клас на базе суцальнай калектывізацыі, з яго агентурай—правымі і «левымі» апартуністамі.

Ленінскае пытаньне «хто каго» вырашана, як у горадзе, так і вёсцы на карысьць сацыялізму, супроць капіталізму. Але гэта не азначае затуханьне клясавай барацьбы. Кулак перамоская, але ягоча канчаткова не забіты. Чым мацней наступленьне сацыялізму па ўсім фронце, тым больш затыўна супраціўляе ца клясавы вораг. Клясавая барацьба ідзе па лініі арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. У калгасах застаюцца элементы клясавай барацьбы.

Зараз кулакі ўжываюць новыя формы, новыя метады барацьбы з калгасамі. Яны менш за ўсё выступаюць адкрыта, больш замаскавана, праз сваіх агентаў уплываюць на адсталую частку калгасьнікаў, распальваюць абажывоцка-рвацкія настроі.

Пралезшы з пэўнай дэзарганізатарскай мэтай у калгасы, кулакі выбраді для атакі калгаснай вытворчасьці, для разбурэньня калгасаў з сярэдзінны самае кулае месца—разьмеркаваньне даходу. Імкнна разьмеркаваньне больш за ўсё цікавіць калгасьніка. Пры разьмеркаваньні калгасьнікі падводзяць вынікі сваёй газдвой работы, упэўніваюцца ў перавазе калектыўнай працы.

Разьмеркаваньне, правяденае па працадзнёх, узмацнае працуцьцяшасьць працы. Узрастаўка ослабіце продукцыйнасьць дыспыпліну. Кулакі і яго агентура агітуюць за ўрэзаўку, знішчэньне кошту продацтва, за асяцяньне таварных лішкаў у калгасах.

Вось чаму партарганізацыі асабліва пільна павінны сачыць за захаваньнем пры разьмеркаваньні асноўнага лёзунгу—атрымліваць больш той, хто больш і лепш працуе. Трэба зараз жа ўжыць усе захады да канчаткова разьмеркаваньня даходу ва ўсіх калгасах, выправіць памылкі папярэдняга разьмеркаваньня, не дапускаць штучнага зьніжэньня даходнасьці працадзеньня.

Абвяльчка ў доглядзе жывёлы, с.-г. інвэнтару выгодна толькі кулаку. Кулак цалкам галасуе за абвяльчку. У сувязі з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы кулак ягоча больш актывізуецца. Ён імкнецца сарваць 100 проц. выкаваньне плянаў загатовак, ссыпку насенных фондаў, выступае за разбазарваньне маладняка, супроць опэцыялізацыі, за зьніжэньне таварнасьці калгаснай гаспадаркі.

Задача партарганізацый заключаецца ў тым, каб ягоча больш мабілізаваць калгасныя масы, бедняцкіх і серадняцкіх дзяцасобнікаў на барацьбу з кулаком. У некаторых раёнах засьмечанасьць калгасаў надта вялікая. Трэба правесьці штодзённую работу па ачыстцы калгасаў ад кулакоў, ад клясава-чужых элемэнтаў. Гэта зьдзяйсьніцца адзіна з умоў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы. Біць па кулаку правільнай арганізацыяй працы, ліквідацыяй абвяльчкі і ўрэзаўкі, узмацненьнем працадзённасьці. Разгортваньнем культурна-масавай работы выхоўваць калгасьніка, вытрачаць дробна-ўласьніцкую псыхалёгію, прывучаць да бярэжлівых адносін у выкарыстаньні сродкаў вытворчасьці.

Кулацкія ўплывы маюць месца ня толькі на адсталую частку калгасьнікаў, але ваюць на паасобных парт'ячэйкі, на паасобных камуністаў. Старшыня калгасу «Камунар», Старобінскага раёну—Бойка (ён жа сакратар парт'ячэйкі) актыўна абараняе кулакоў, сам фактычна выступае супроць калгаснага будаўніцтва, не змагаецца за ажыцьцяўленьне статуту сельска-гаспадарчай арцелі. Бойка ягоцкі свой клясавы тыр, зросься з кулацтвам, аллюстроўвае настрої кулакоў. Гэта павінна напомніць кожнай партарганізацыі пастанову XVII партканфэрэнцыі аб асноўнай задачы «далейшага разгортваньня барацьбы з апартуністамі і асабліва з правымі ухілам—як галоўнай небясьпекі на даным этапе».

Адначасова трэба змагацца і з «левакамі», якія дапускаюць антысерадняцкія перагібы, займаюцца голым адміністраваньнем, ігнаруюць масавую работу, льлюць ваду на млын клясавага ворага — кулака.

Наша асноўная цэнтральная задача на вёсцы—поўнае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 4 лютага. арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне пасеўных плянаў, завяршэньне суцальнай калектывізацыі БССР у 1932-33 годзе і на яе аснове ліквідацыі кулацтва як класы.

Разбазарваюць ільнавалакно

БЯРЭЗІНА. Кулацкая група, стаўшы на чале калгасу «Перамога», Багушэвіцкага сельсавету, ашукае бядняцка-серадняцкую частку, зрыхае ўсе мерапрыемствы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Кудзін, Трапянок, Каваленка разбазарваюць ільнавалакно, наўмысна ламаюць адрамантаваныя плугі, не даюць калгасьнікам дні работы сваіх коней.

Старшыня калгасу Дарафейчык Тодар, падпаўшы пад кулацкі ўплыў, трапіў на гарэлку калгасныя грошы, крадзе збожжа і г. д. Настаўнік Каваленка А., выхадзец з кулацкай сям'і, увесь час падбухторвае калгасьнікаў, каб яны на выконвалі пляну па загатоўках.

У кіраўніцкай мясцовай парт'ячэйкі прытушілася клясавая пільнасьць, яны ягоча да гэтага часу не ўжылі адпаведных захадаў для ачысткі калгасаў ад клясава-чужых элемэнтаў.

Латуньней.

Праверыць становішча калгасаў Лістападаўскага сельсавету

СТАРОБІН. У адзін з буйнейшых калгасаў «Камунар», Лістападаўскага сельсавету, пралезла значная частка замоніжкаў, кулакоў, клясава-варожых элемэнтаў. Яны ўвесь час падрываюць работу, зрываюць правядзеньне ўсіх агрэмадніцкіх сьвяцей батраком.

Побач з калгасам «Камунар» у калгасе «Камінтэрн» клясава-варожы элемэнт—Грыцкевіч Іван — вядзе агітацыю сярод калгасьнікаў за разбурэньне калгасу, выступае з контр-рэвалюцыйнымі, антысавецкімі прамовамі і г. д. Праўленьне калгасу «Камінтэрн» вынесла пастанову аб выключэньні Грыцкевіча з калгасу. Бойка, як сакратар парт'ячэйкі, замест таго, каб завастрыць увагу калгасьнікаў на барацьбе з клясавым ворагам—кулаком пастаяў на скасаваньні пастановы аб выключэньні Грыцкевіча з калгасу.

Бойка не паставіў пытаньне аб прыцягненні да адказнасьці капітулянтаў партыі братоў Бародка, якія, будучы ў калгасе, не агрэмадніваюць і не жадаюць агрэмадніваць сродкаў вытворчасьці.

Старобінскаму раённому КП(б)Б неабходна зараз-жа правяраць становішча калгасаў Лістападаўскага сельсавету, рашуча ўдарыць па правасапартуністычнай практыцы пасобных парт'ячэек, выключыць з партыі махровых апартуністаў.

Рабселькораўская брыгада:
Цазй, Даўмацэня, Скалабан, Жук.

Клясавы вораг разбурае камуну Імя Фрунзэ

ПУХАВІЧЫ.

У камуне імя Фрунзэ, Пярожэрскага с.-савету, даходы разьмеркаваны не па працадзнёх, а па ядзоным прынципе. Малако і масла вылучна выключна тым, хто «пагадзіцца» старшыні камуны Напрыклад, член савету камуны Савіч усё лета гультаяваў, не працаваў, а між тым атрымаў 16 кгр. масла. Гэты самы Савіч увесь час сутыкаўся увядзеньню зьвяльчыны. Збожжа і карму выдаткоўваюцца бяз улику, што стварае глебу для злоўжываньняў.

Пралезшы ў камуну і нават у савет камуны, вузкі Ахрамовіч, былы ўпраўляючы майткам Станкевіча, паркоўны служка Барысёнак зрываюць ня толькі разьмеркаваньне даходаў па працадзнёх, але актыўна выступаюць супроць усіх гаспадарча-палітычных кампаній, своёй шкодніцкай дзейнасьцю вядуць камуну да заняпаду.

Старшыня камуны Сарокін, падпаўшы пад уплыў клясавага ворага, настаяў на выключэньні з камуны старшыні рэвізійнай камісіі Попка і камунара-бедняка Бачыла за тое, што яны дамагаліся, каб даходы былі разьмеркаваны па працадзнёх.

Камуна імя Фрунзэ павінна быць тэрміновa ачышчана ад клясава-чужых элемэнтаў. Пухавіцкаму райвыканкамсавету трэба выправіць памылкі, якія дапушчаны пры разьмеркаваньні даходу.

Камунар.

Наладзіць паказальны суд

ЛАГОЙСК. Калгас імя Варашылава вёскі Пазьвоўя, Лагойскага сельсавету, засьмечан клясава-варожым элемэнтам. Кулакі Радкевіч, Ляўданскі, Міранові, Рудак і інш. уступілі ў калгас з тай мэтай, каб ухіліцца ад індывідуальнага абкладаньня. Да ўступленьня ў калгас яны разбазарылі жывёлу, прадалі коней і г. д.

Гэтыя «бядняцкі» арганізавана выбралі старшынёю калгасу Рудака, які да 1931 году карыстаўся наёмнай рабочай сілай, як кулак жыў за кошт працы батракоў.

Кулакі на чале з Рудаком паставілі своёй мэтай ушчэнт разваліць калгас. Агрэмадніваньне коні ўжо прыведзены ў нягодзнасьць, сельгасінвэнтар пашкодзілі, абкалочванае збожжа спэцыяльна пакідаюць на таку, каб яго можна было красьці. Сам Рудак некалькі раз вазіў у Менск на прыватны рынак пакрадзеную ў калгасе шпаніцу і авёс.

Уся вёска гаворыць, што пакуль Рудака ня вычысьцяць, ніхто з актыўнасьцю — бедняцкоў і сераднякоў у калгас імя Варашылава ўступаць ня будзе.

Патрэбна ўжыць тэрміновыя меры па ачыстцы калгасу ад кулакоў. Над шайкай шкодніцкаў, злачынцаў на чале з Рудаком трэба наладзіць паказальны суд.

Ведаючы.

АЛІЛЮЙШЧЫКІ

(„КАЛГАСЬНІК“, ЧЫРВОНАСЛАБОДЗКІ РАЁН)

АГЛЯД ДРУКУ

Адзначаючы 16 студзеня свой першы гадавы юбілей «КАЛГАСЬНІК» называў сябе

«...сапраўднай зброяй раённага камітэту ў арганізацыі калгасных мас...»

Юбіляра нельга было папракнуць у празьмернай скромнасьці. Наадварот, газэта шчодра надзяляла сама сябе гарачымі пахвалямі. «Калгасьнік» пісаў, што ён дасягнуў

«...значных посьпехаў у бязьлітаснай барацьбе з кулацтвам і яго агентурай — правымі і «левымі» апартуністамі».

Дзіўна толькі, што гэтых слоў «Калгасьнік» не пацьвердзіў ні адным канкрэтным фактам. Зьмест «значных посьпехаў» застаўся глыбокай тайнай рэдакцыі. Тайна гэта, аднак, становіцца ясная пасьля азнаямленьня з камплектамі газэты...

У радзе сельсаветаў раёну за апошні час дапушчаны «лявацкія» загібы. У прыватнасьці, у Старчыцкім, Макрапскім, Смоліцкім і Бучашынскім сельсаветах масавая і арганізатарская работа надмяняецца «лявацкім» адміністраваньнем. У гэтых сельсаветах было ня мала фактаў, калі мясцовыя «левакі» механічна перапосілі палітыку, пакіраваную супроць кулака, па беднякоў і сераднякоў.

Ня думайце, аднак, што «Калгасьнік» рашуча змагаўся супроць «лявацкіх» перагібаў. Адна справа хвалець самога сябе ў юбілейнай перадавой і другая — пе на словах, а на практыцы змагацца супроць правых і «левых» апартуністаў. У «Калгасьніка» якраз словы разка разыходзяцца са справамі.

Найбольш грубыя «лявацкія» перагібы дапушчаны, як піша сам «Калгасьнік», у Старчыцкім сельсавеце:

«Лявацкія» скажэньні лініі партыі, асабліва ў Старчыцкім сельсавеце, непарыўна злучаны з галавацкім адміністраваньнем, з поўным ігнараваньнем і недазцэнкай арганізацыйнай і выхаваўча-масавай работы» (№ 8, 10 лютага).

Выходзіць, як бачыце, што «лявацкія» скажэньні «непарыўна злучаны»... з «лявацкімі» скажэньнямі. Яўная, мякка кажучы, блытаніна. Справа, аднак, ня ў гэтым. Цікава прасачыць, як «Калгасьнік» змагаўся з «лявацкімі» перагібамі, дапушчанымі ў сельсаветах раёну.

Аб Старчыцкім сельсавеце «Калгасьнік» пісаў яшчэ ў сьнежні. Тады-ж у сельсавеце працавала нават выязная рэдакцыя газэты. Яшчэ ў сьнежні «Калгасьнік», так сказаць, сыгналізаваў, што Старчыцкі сельсавет знаходзіцца «ў абдымках апартунізму». Гэта, аднак, не перашкодзіла газэце старанна затушаваць палітычны сэнс справы і скромна прамаўчаць аб канкрэтных посьбітах зла.

Топ матар'ялаў выяной рэдакцыі:

«— Старчыцкі сельсавет у абдымках апартунізму. — Адрыў ад мас, ігнараваньне культурна - масавай работы, недаацэнка аднаасобнага сэктару, адсутнасьць работы з беднатой паставілі савет і парт'ячэйку ў тып (?) глыбокіх прарываў...»

«...Старчыцкі сельсавет, партыйная і камсамольская ячэйка апынуліся ў паласе глыбокіх прарываў» (№ 37, і сьнежня).

Падобнымі матар'яламі занята цэлая паласа газэты. Гэта, аднак, толькі крык, хаця і грозны, але ня страшны для старчыцкіх апартуністаў. «Калгасьнік» скромна ўнікае вывадаў. Ён толькі бяззуба шамкае аб «глыбокім тыле ганебных прарываў».

Вось яго адзіныя вывады па сельсавеце

«Старчыцкі савет павінен быў ісьці ў радах лепшых...

Але савет апынуўся ў глыбокім тыле ганебных прарываў у выкананьні гаспадарча-палітычных кампаній. Савет цягнецца ў хвасьце»

і па ячэйцы

«Сельсавет і ячэйка апынуліся ў балоце апартунізму... Партыйная ячэйка павінна ўзяцца за выпраўленьне дапушчаных прарываў...»

Газэта мімаходам адзначае, што ў Старчыцкім сельсавеце дапушчан рад «лявацкіх» перагібаў ВА УСІХ паселішчах і вёсках. Як бачыце, абвінавачаньне самае сур'ёзнае. Справа ідзе аб «лявацкай» практыцы, якая, судзячы па газэце, увайшла ў сыстэму работы сельсавету. Не падумайце, аднак, што «Калгасьнік» рашуча ўдарае па дапушчаных скажэньнях. Нічога падобнага. Газэта проста ўпрошвае старчыцкіх «левакоў» растлумачыць, чаму сельсавет «робіць такія памылкі» (?) Так разважае выязная рэдакцыя з сельсаветам, які, паводле слоў самога «Калгасьніка», «згубіў клясавую чуласьць», у якім «лявацкія» перагібы дапушчаны па «ўсіх вёсках і пасежышах...»

Вось і ўсё, што зрабіла газэта. Пакрычала, памахала кулакамі і супакоілася. «Калгасьнік» не дадумаўся нават сказаць хаця-б адно слова аб тым, што «лявацкія» перагібы павінны быць неадкладна выпраўлены.

Нельга, зразумела, адмаўляць пэўнай заслугі газэты ў тым, што яна, калі хочаце, сыгналізавала аб апартуністычнай практыцы ў сельсавеце. Але зрабіла яна гэта бяззуба, канкрэтных посьбітаў апартунізму ня выкрыла, па перагібшчыках ня ўдарыла. Карацей кажучы, сама сваю-ж заслугу зьвяла да нуля.

Больш аб «лявацкіх» перагібах, дапушчаных у раёне, газэта да лютага ня ўспамінала. У кожным нумары «Калгасьніка», праўда, не шкадаваў месца для фраз аб барацьбе супроць правых і «левых» апартуністаў, але гэта былі толькі фразы, знаёмая і нудная аллюя.

Пад носам газэты «левакі» на сьвядах Старчыцкага сельсавету праводзілі сваю кулацкую работу. Газэта-ж маўчала. І толькі тады, калі выплылі на паверхню факты «лявацкіх» перагібаў у цэлым радзе іншых сельсаветаў, у газэты пачакала разьвязацца язык. Два месяцы (сьнежань і студзень) «Калгасьнік» маўчаў, а потым рэшчэўна забіў трывогу. 9-га лютага на старонках «Калгасьніка» зьяўляецца перадавая «Мацней агонь па правых і «левых» дэзарганізатарах». Аказваецца і ў Мазкраўскім і ў Смаліцкім і ў Бучацінскім, а таксама і ў некаторых іншых сельсаветах хаваюць месца

«... АДМІНІСТРАВАНЬНЕ, ГАЛАВАЦЯПСКІ ПАДЫХОД ДА БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІХ МАС АД НААСОБНІКАЎ».

Аказваецца і ў гэтых сельсаветах дапускаюцца грубейшыя «лявацкія» загібы. Дзе-ж газэта была раней, чому яна не сыгналізавала аб сапраўдным становішчы спраў? Невядома. У чым-жа ў такім выпадку заключаецца «значныя посьпехі» «Калгасьніка» ў барацьбе з правымі і «левымі» апартуністамі.

Але і гэтыя абвінавачаньні толькі крык. Газэта крычыць, што ў радзе сельсаветаў дапускаюцца «лявацкія» перагібы, але не называе канкрэтных посьбітаў зла. «Калгасьнік» апэрує толькі фактамі з практыкі Старчыцкага сельсавету, аб якіх ён-жа сам пісаў яшчэ ў сьнежні. А гутарка-ж ідзе аб тым, што ня ў сьнежні, а зараз, у лютым у цэлым радзе сельсаветаў

«... назіраюцца адміністраваньне галавацкі падыход да бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў».

Зноў газэта не ўдарае па-бальшавіцку па «левакох», а сьпявае сваё аллюя. Зноў газэта не называе канкрэтных посьбітаў зла.

«Калгасьнік» утапае ў агульных фразах. Ён растлумачвае, што апартуністы імкнуцца «пераскочыць праз апошні этап НЭП'у», але старонка маўчыць, хто-ж канкрэтна дапускае «левыя» загібы ў раёне, хто-ж канкрэтна падмяняе масавую работу галавацкім адміністраваньнем. Ён патрабуе ўлічыць урокі Мазкраўскага сельсавету, але галкатна маўчыць, у чым-жа гэтыя ўрокі заключаюцца.

Ня гэта пікаліць газэту. Ёй няма ніякай справы да канкрэтных посьбітаў «лявацкай» практыкі ў раёне. «Калгасьнік» лічыць больш мэтазгодным давесьці, што трацкісты — зусім не перадавы атрад контр-рэвалюцыі, а проста... агентура варожых клясаў у нашых радах. «Калгасьнік» піша:

«Партарганізацыі раёну павінны добра памятаць, што агентура варожых клясаў у нашых радах — трацкізм і правы апартунізм выкрыты і нагаплаву разьбіты...»

Як бачыце, «Калгасьніку» няма ніякай справы, што трацкізм даўным-даўно не ратвараўся ў перадавы атрад міжнароднай контр-рэвалюцыі. Па думцы рэдакцыі, контр-рэвалюцыйныя трацкісты проста ўхілісты ад лініі партыі.

Вывады напрашваюцца самі. Газэта палмяне барацьбу з «лявацкімі» перагібамі, якія ўмацаняюць пазыцыі правага апартунізму — галоўнай небясьпекі, аллюйскімі заклінаньнямі. КЛЯСАВАЯ ПІЛЬНАСЬЦЬ «КАЛГАСЬНІКА» ПРЫТУПІЛАСЬ.

І. ФЭЛЬДМАН

За выразнае плянаваньне сельска-гаспадарчага крэдыту

Партыя дасягнула рашаючых посьпехаў у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Звыш 60 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак абъядналіся ў калгасы. Асноўным пытаньнем вакол якога ў даны перыяд канцэнтруюцца намаганьні партыі стала арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калектыўных гаспадарак.

XVII усесаюзная партканфэрэнцыя, якая нядаўна скончылася, з усёй сілай падкрэсьліла вялізнае значэньне гэтай праблемы: «Задачы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і сацыялістычнага выхаваньня калгасных мас павінны стаяць у цэнтры ўвагі і ў другой пяцігодцы» (з рэзалюцыі па дакладах т. т. Молатава і Куйбышава).

Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 4 лютага мабілізаваў увагу ўсёй партыі на разьвіцьці і ўзмацненьні арцельнай формы калгасаў, рашуча палярызуючы супроць перакідваньня праз гэту ступень калгаснага будаўніцтва.

Адным з вялікіх стымулаў арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, павышэньня якасных паказальнікаў работы, пазьбяжэньня таварнасьці гаспадаркі зьяўляецца дзяржаўны крэдыт. Апошні ня толькі падводзіць магутную матэрыяльную базу пад калгаснае будаўніцтва (што само ўжо зьяўляецца вельмі сур'ёзным фактам росту калектыўных гаспадарак), але дапамагае арганізаці фінансавай гаспадаркі калгасаў, дае магчымасьць наладзіць кантроль за выкананьнем вытворчых заданьняў, стымулюе ўнутраныя накапленьні і сыстэматычны рост прадукцыі.

Трэба, аднак, падкрэсьліць, што мэтады гаспадарчага разрахунку ў калгасах ня могуць дакладна нагадваць мэтады, што ўжываюцца ў саўгасах і вагонуп у дзяржаўных сацыялістычных прадпрыемствах. Гэта з належнай выразнасьцю адзначана тав. Молатавым у яго заключным слове на XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі.

— Партыя — указаў тав. Молатаў — падкрэсьлівае значэньне правядзеньня гаспадарчага разрахунку ў гаспадарчых органах і прадпрыемствах, прадпрыемствах і саўгасах. І ў даным выпадку ў адносінах да калгасаў павінна быць ужыта свая, асаблівая мерка. Справа ў тым, што калгасьнікі — поўныя гаспадары сваёй арцелі, а з гэтага — у дным выпадку асабліва відавочна — выцягваюць асобныя выгады, якія ня могуць быць ужыты на дзяржаўна-сацыялістычных прадпрыемствах. З гэтага выцякае, як вядома, з аднаго боку, тое, што ўвесь дадатковы даход калгасу (напрыклад, у выніку спэцыяльных мер па ўзьнятьці продукцыйнасьці працы ў калгасе) зьяўляецца поўным здабыткам калгасьнікаў і дапага калектыву ў цэлым. А з другога боку, у тым выпадку, калі калгас у выніку тых ці іншых прычын (дапусьцім, ягонай уборкі ўраджаю) страціў пэўную частку сваіх даходаў, то гэта таксама цалкам падае за кошт самих калгасьнікаў і толькі іх калгасу. Зразумела, у жыцьці да гэтага пазначэньня ўносіцца ня мала рознага роду частковых паправак і дапаўненьняў, але сутнасьць усё-ж заключаецца і тут у тым, што на калгасы нельга пераносіць звычайных для нашых дзяржаўных прадпрыемстваў норм гаспадарчага разрахунку.

Мы прыняй гэту пытату таму, што ў ёй з вычарпальнай ясьнасьцю падкрэслена розьніца ў правядзеньні гаспадарчага разрахунку ў калгасах і саўгасах.

Але было-б самай грубай памылкай з гэтай розьніцы рабіць вывад, што мэтады гаспадарчага разрахунку зусім ці амаль нельга ўжываць у калгасах. Немагчыма на данай стадыі сацыялістычнага будаўніцтва дабіцца рашаючых посьпехаў у галіне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў без скарыстаньня нагара гаспадарчага разрахунку. Бо гаспадарчы разрахунак у калгасе — гэта, у першую чаргу, барацьба зэ правільную арганізацыю працы, за якасьць работы, за павышэньне ўраджайнасьці, за высокую таварнасьць, за рэнтабельнасьць гаспадаркі. Дзяржаўны крэдыт, што даецца калгасам, — гэта адзін са шляхоў укараненьня гаспадарчага разрахунку ў калгасах, а значыць і сур'ёзны стымул арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня апошніх.

Правільная арганізацыя крэдытаваньня калгасаў патрабуе ў першую чаргу выразнага і канкрэтнага плянаваньня. Наколькі важнае значэньне мае гэта пытаньне, відаць з выніку крэдытаваньня калгасаў у мінулым 1931 годзе.

Крэдытныя пляны былі спушчаны Наркамзэмам і Калгаспэнтрам у раёны толькі 29 чэрвеня, і гэта прывяло да таго, што крэдытаваньне калгасаў на працягу паўгода праводзілася без дакладна распрацаванага гадавага плянаў. Апрача таго сума разасыгнаваных крэдытаў значна перавысіла фактычныя сродкі, якія былі вызначаны для БССР, паводле пастановы Саюзнага СНК (разьмеркавана 36,5 млн. руб. пры патрэбнасьці крэдытаў у разьмеры 31,9 млн.).

У першым квартале, напрыклад, лімітыі цэнтру склаталі 9 млн руб., плян Калгаспэнтру БССР — 9,7 млн., у другім паўгодзьдзі адпаведна — 15,5 і 19 млн.руб., у трэцім квартале — 10,4 і 12,2 млн. руб., у чацьвертым — 7,2 і 14,9 млн. руб. Прычым плян, зацьверджаны Дзяржплянам БССР, склаў у другім паўгодзьдзі 21,5 млн. руб., у трэцім — 14,3, а ў чацьвертым — 12,2.

Некаторае ўяўленьне аб ходзе выкананьня пляну крэдытаваньня сельскай гаспадаркі ў 1931 годзе дае наступная табліца.

Асноўныя мерапрыемствы	Гадавы плян (у тыс. руб.)	Выканана	Процант выкананьня пляну
1. Уся жывёлагадоўля	21.851,21	10.525,1	48,1
2. Мерапрыемствы па пасеўных кампаніях веснавой і асеньняй	9.092,86	7.784,1	85,6
3. Будаўніцтва на насенаводзтве	374,2	110,2	29,4
4. Сельгаспдустрыялізацыя	572,4	520,8	90,9
5. Маліярыя	563,6	54,6	9,7
6. Іншыя мерапрыемствы	2583,87	1961,5	7,59
УСЯГО	35.037,54	20.956,3	59,8

Гэта табліца дае толькі некаторае, далёка ня поўнае ўяўленьне аб выкананьні крэдытнага пляну па сельскай гаспадарцы таму, што яе паказальнікі адлюстроўваюць толькі фармальны банкаўскі ўлік выкарыстаньня крэдытаў. Між тым, вядома, што калгасы пры адсутнасьці пакуль што выстарчальнага кантролю з боку банку вельмі часта выкарыстоўваюць атрыманыя ад дзяржавы крэдыты не па непасрэдным прызначэньні, а часамі нават на нявытворчыя патрэбы гаспадаркі.

Асабліва вялікае непавыкарыстаньне адпушчаных крэдытаў назіраецца ў галіне мерапрыемстваў, зьвязаных з жывёлагадоўляй. Гэта выклікана, папершае, недавыкананьнем у гэтай галіне сельскай гаспадаркі вытворчых заданьняў, па-другое, вельмі нязбайным вылічэньнем патрэб у крэдыце. У гэтым, да рэчы сказаць, адлюстроўваецца выключна нясур'ёзныя адносіны да дзяржаўных сродкаў з боку органаў, якія плянуюць сельскую гаспадарку, якія свае крэдытныя заяўкі на будаўніцтва вылічаюць, выходзячы ў асноўным з новага будаўніцтва; між тым, будаўніцтва ажыцьцяўлялася галоўным чынам за кошт прыстасаваньня старых памяшканьняў у калгасах, што патрабавала значна меншых сродкаў, чым гэта прадугледжвалася ў заяўках.

Гэтымі-ж дзьвюма прычынамі можна таксама вытлумачыць недавыкананьне і іншых частак крэдытнага пляну. У прыватнасьці, мізэрнае скарыстаньне крэдытаў на маліярацыю (54,6 тыс. руб. замест 563.000 руб., адпушчаных паводле пляну) зьвязана з поўным зрывам выкананьня заданьня ў гэтай галіне.

Характарыстыка прычын невыкананьня пляну крэдытаваньня была-б няпоўнай, калі-б ня ўспомніць яшчэ аб адным вялікім недахопе ў галіне пляніраваньня — груба механічным разьмеркаваньні сродкаў па прызначэньнях і раёнах, без уліку канкрэтных умоў, патрэб і магчымасьцяй данага раёну і калгасу.

Такое «плянаваньне», якое ажыцьцяўлялася не на основе дакладных даных, а на падставе павярхоўных вылічэньняў, «на вока» прыводзіла да вялікіх хістаньняў у выкананьні плянаў крэдытаваньня па раёнах. Так, гадавы плян крэдытаваньня будаўніцтва абораў выканан па Вушацкім раёне на 138 проц., па Магілеўскім — на 120 проц., па Полацкім — на 115 проц., па Расонскім — на 101 проц., а па Чэрвеньскім — толькі на 4 проц., па Клічаўскім — на 7 проц., па Бешанковіцкім — 7 проц., па Мсьціслаўскім—на 11 проц.

Характэрна, што ў паасобных раёнах крэдыты, адпушчаныя па розных мерапрыемствы, пераважна застаюцца нявыкарыстанымі таму, што калгасы не адчуваюць у іх патрэбы. Напрыклад, у Дубровенскім раёне вытворчыя заданьні па камплектаваньні сьвінаматкамі выкананы на 137,5 проц., а плян крэдытаваньня камплектаваньня выкананы на 22,8 проц.; у Прысенскім раёне камплектаваньне сьвінаматак праведзена на 171 проц. пляну, а крэдыты выкарыстаны па 22,7 проц.; у Чэрыкаўскім раёне вытворчыя заданьні выкананы на 90,1 проц., а плян крэдытаваньня — на 1,8 проц.

Асабліва цікавым зьяўляецца наступны факт, які меў месца ў Чэрыкаўскім раёне. Гэтаму раёну на працягу трох першых кварталаў 1931 году адпушчана 38,49 тыс. руб. на ўкамплектаваньне сьвінога стада. Грошы гэтыя ня выкарыстаны, між тым вытворчае заданьне па ўкамплектаваньні стала выкананa па 60,1 проц. У чацьвертым квартале гэтаму раёну адпушчана яшчэ 15,67 тыс. руб. крэдыту, з якіх выкарыстоўваецца толькі 1.000 руб., плян-жа камплектаваньня выканан на 90,1 проц. (на 10 сьнежня).

Як мы бачым, у радзе раёнаў калгасы шляхам мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў маюць магчымасьць парматальна выконваць вытворчыя заданьні, нават перавыконваць іх, не звяртаючыся да дзяржаўнага крэдыту.

Нашы-ж цэнтральныя зямельныя і калгасныя арганізацыі замест перакідкі грошай у тыя раёны, дзе крэдыты вельмі патрэбны, замарожваюць, а ў некаторых выпадках, як гэта мы бачылі па прыкладзе Чэрыкаўшчыны, працягваюць кідаць у раён новых крэдыты, хоць патрэбы ў іх ніякай няма.

Многія раённыя зямельныя і калгасныя органы ў практыцы плянаваньня маюць вялікія недахопы. Калі НКЗ і Калгаспэнтр вылічаюць крэдыты для раёнаў у цэлым «з паветра», то земадзелы і райкалгасаюзы такім-жа прыкладна, спосабам устанаўліваюць крэдыты ўжо непасрэдна для калгасаў.

Як мы бачым, пытаньне правільнага плянаваньня сельска-гаспадарчага крэдыту цесна зьвязана з важнейшымі праблемамі калгаснага будаўніцтва, з арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў у першую чаргу. Праверка выкананьня пляну сельскай гаспадаркі, максымальная эфэктыўнасьць крэдыту пры разгледжаных вышэй мэтадах плянаваньня ператвараецца ў фікцыю.

Для таго, каб крэдыт зрабіўся дзейсным вагаром сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, трэба зараз-жа ўзяцца за пастаноўку правільнага яго плянаваньня зьверху да нізу. Трэба, каб крэдыт строга адпавядаў вытворчым заданьням калгасаў, каб ён вылічваўся «не з паветра», а ца аснове сапраўдных патрэб і магчымасьцяй раёну і калгасу. За гэту справу ў першую чаргу павінны ўзяцца НКЗ і Калгаспэнтр.

Штодзённая барацьба супроць апартуністычных скажэньняў лініі партыі ў пытаньнях сельска - гаспадарчага крэдыту зьяўляецца адной з важнейшых працасьцяй ажыцьцяўленьня пастаноў XVII партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б, ажыцьцяўленьня задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Арганізуем сацспаборніцтва заводаў

на лепшыя сустрэчныя пляны барацьбы за тэхніка-эканамічную незалежнасьць СССР

„...Навука, тэхнічны вопыт, веды—усё гэта справа нажыўная, сёньня няма іх, а заўтра будуць. Галоўнае тут заключаецца ў тым, каб мець палкае жаданьне аўладаць тэхнікай, аўладаць навукай вытворчасьці. Пры палкім жаданьні можна дабіцца ўсяго, перамагчы ўсё". (СТАЛІН).

У фонд тэхніка-эканамічнай незалежнасьці

ВІЦЕБСК. Газэта «Віцебскі пралетар» адкрыла збор прапаноў і абавязацельстваў у фонд тэхніка-эканамічнай незалежнасьці СССР. Рэдакцыя «Віцебскага пралетара», прматтыражка «Наймоніца» і ЦП саюзу тэкстыльшчыкаў правялі папыраную нараду адм.-тэхн. персаналу, рацыяналізатараў і лепшых ударнікаў фабрык імя Клары Цэткін, «КІМ» і голкавай па пытаньні максымальнай эканоміі імпартных голак для вязальных аўтаматаў. Нарада прыняла рад канкрэтных мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць эканомію голак і іх рамонт.

По ініцыятыве «Віцебскага пралетара» праведзена вытворчая нарада голкавай і акулярнай фабрык, агульна-гарадзкая нарада замежных спэцыялістаў і г. д.

Паход за аўладаньне тэхнікай выклікаў вялікі творчы ўздым на разэ прадпрыемстваў. Гэты ўздым знайшоў сваё адлюстраваньне ў росьце каштоўных рацыяналізатарскіх прапаноў рабочых і ІТР.

Тэхнік акулярнай фабрыкі т. **Арш** учёс у фонд тэхніка-эканамічнай незалежнасьці СССР канструкцыю аўтаматаў для абточкі цэлюлёідных заўтулкаў для апрацоўкі акуляраў. Тэхнік-канструктар тав. **Кулібакаў** учёс мадэль аўтаматычнай адвёрткі і штамп ну для вырабу аптычнага прадукцыі. Гэта канструкцыя раней увозілася з-за межы. Тэхнік **Нюрэнбэрг** прапанаваў каштоўнейшае рацыяналізатарскае мерапрыемства па замене каляровых металяў чорнымі.

Арганізацыі **панчошнай фабрыкі імя КІМ** разгарнулі вялікую работу па вызваленьні фабрыкі ад імпарту голак. Лепшыя ўдарнікі фабрыкі паказваюць узоры эканоміі ў выдаткавачыні гэтых голак. Тав. **Анетава** замест 0.5 паводле пляну выдатковае 0.34 проц.; работніца **Малацова** за аднну зьмену з'эканоміла 6 проц. голак супроць пляну. Загачык цэхам тав. **Гофман** і яго памічнік тав. **Лісюк** вынайшлі варыянт для рамонту голак. 2 рабочыя за адзін дзень рамонтуюць 250 штук. Калі раней нажы для швэйна-пецельных машын прывозіліся з-за межы і каштавалі 1 руб. 20 кап. золатам, дык зараз яны вырабляюцца непасрэдна на фабрыцы і каштуюць 75 кап. пара; па сваёй якасьці яны ня горшыя за замежныя.

На панчошнай фабрыцы імя Клары Цэткін прыступілі да вырабу запасных частак — эксцэнтрыкаў, цыліндраў, плацінавых колец, якія раней прывозіліся з-за межаў.

Вялізарную работу па асваеньні новых вытворчасьцяй праводзіць **акулярная фабрыка.** Калі раней фарматачныя чашкі для вырабу аптычнага шкла прывозіліся з Нямеччыны і каштавалі 300 руб. золатам кожная, дык зараз фабрыка самастойна выробляе гэтыя чашкі, якасьць іх ня нізкая за замежныя і каштуюць яны толькі 30 руб. Дзякуючы актыўнасьці сьлесараў - штамповушчыкаў, штампы зараз робяцца з савецкай сталі; нізоўнага імпартнага штампу фабрыка не закупляе.

Значныя дасягненьні атрымала **швэйная фабрыка «Прафінтэрн».** 14 машын сыстэмы «Аплер», якія 2 гады стаялі з-за адсутнасьці імпартных запасных частак, зараз пушчаны ў ход. Выхадзіла фабрыкі тав. **Дубінін** замяніў імпартныя часткі машын саморобкамі, што дало фабрыцы 2.000 руб. эканоміі.

Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі пралетары Віцебшчыны пабальшавіцку змагаюцца за перамогу ў заваяваньні тэхніка-эканамічнай незалежнасьці СССР.

Арк. Зарубежны і Х. Левіка.

Наладжан выраб электра-закройных машын

Мэханічныя майстэрні Белшвэйабʼяднаньня існуюць з 1930 г. Імі праведзена вялікая работа па асваеньні вырабу швэйных машын і прылад, якія ўвесь час імпартаваліся з-за межы. Выпускаюцца электра-закройныя машыны, якімі забясьпечваецца ня толькі швэйная прамысловасьць БССР, але і іншыя рэбны Саюзу: Ленінград, Масква, Растоў, Іркуцк і г. д. Гэтыя машыны значна таньнейшы за імпартныя і спэцыяльна прыстасаваны на ўмоў працы на швэйных фабрыках БССР.

Закончана работа па скапіраваньні вельмі складанай машыны «Парфюратар», якая ўвесь час імпартавалася і абыходзілася ў 500 руб. золатам.

Майстэрні выпускаюць таксама каштоўныя запасныя часткі да швэйных машын. Адсутнасьць запасных частак выклікала дагэтуль частыя прастоі на швэйных прадпрыемствах. Треба падкрэсьліць, што гэтыя часткі раней у большасьці ўвозіліся з-за межы.

Майстэрні займаюцца таксама выкананьнем рабочых прапаноў у галіне рацыяналізацыі і мэханізацыі швэйнай прамысловасьці. Ужо скончана канструкцыя першай машыны для дэкатыроўкі тканін. Раней дэкатыроўка праводзілася ручным спосабам, што выклікала дрэнную якасьць і нізкую прадукцыйнасьць працы. Дэкатыровачная машына, што выпускаецца майстэрнямі, дае магчымасьць значна ўзвысіць якасьць прадукцыі і дае 50 тыс. руб. эканоміі у год.

Закончаецца праграцоўка вельмі каштоўнай прапановы, як наладжаньне біяспасавай перадачы для нізкіх машын, што дасьць магчымасьць з'эканоміць на швэйных фабрыках БССР звыш 100.000 руб. у год.

Значна перашкаджае рабоце майстэрань адсутнасьць належнага памяшканьня.

ДРЫКЕР.

ІТР „ЧЫРВОНАГА МЭТАЛІСТА" УКЛЮЧЫЛІСЯ У ПАХОД ЗА АЎЛАДАНЬНЕ ТЭХНІКАЙ

Інжынэры і тэхнікі заводу «Чырвоны мэталіст» (Віцебск) уключыліся ў паход за аўладаньне тэхнікай. Яны бераць рад мерапрыемстваў па рэкансструкцыі с.-г. машын, якія выробляюцца заводам. Некаторыя працэсы вырабу бульбасапалак і іншых машын перавядзены на электразварку замест склёпкаваньня. Інструменты і штампы, якія раней выраблялися з імпартнай сталі, зараз выробляюцца са сталі савецкіх заводаў.

Значна палепшана канструкцыя нажа для плуга «Эбэрхардт». Рад чыгуначных дэталяй заменены жалезьнымі, што дало эканомію чыгуну на жмыхдрабільцы 50 кгр. і корнарэзцы—12.

На заводзе створаны тэхнічныя курсы інструктароў, на якіх займаецца 20 чал., курсы па падрыхтоўцы загачыка ўзмацнялкай і абязьлічкай 1 каапэрацыйным апараце, у апараце масавынаў, складаў і адсутнасьць дзейснага, асабліва па вясковым сэктары, кантролю рублём.

Правяроная ЦКК КП(б)Б у сьнежні 1931 году праверка тавараў адстаў выявіла цэлы рад істотных фактаў замарожваньня тавараазвароту. Пры ўмовах нехапкту тавараў аказалася замарожанымі па сыстэме спажыўкаапэрацыі на 8 млн. руб., па Беларусі — на 1.400 тыс. руб. тавараў. Прычым на вялікую сумму замарожаны яўраз тыя тавары, на якія адчуваецца вялікая патрэба. Напрыклад, гатовага адзеньня—на 2.049,3 тыс. руб., абутку—на 1.097,3 тыс. р. і г. д.

Пад відам браніраваньня фондаў і па-іншых прычынах асобныя каапэратыўна-гандлёвыя арганізацыі імкнуцца стварыць запас тавараў для таго, каб опусьціць іх пры «выгоднай кан'юнктуры рынку». Гэта ў першую чаргу адносіцца да лесасэкцыі, якая значна недавыконвае тавараазвароту і ў той-жа час мае замарожаных тавараў па 1.780 тыс руб.

Па віцебскім лесрабкопе, напрыклад, астача тавараў складае 36-дзённы запас замест пляновых 16 дзён. Такія востра-дэфіцытныя тавары, як гатовая вопратка і абутак, рэалізуецца лесрабкопам з выключнай марудлівасьцю.

Тое-ж і па Белгандлі. Для характарыстыкі яго работы ў гэтай галіне прыводзім толькі 2 факты: Белгандлем закуплена іры на 38 тыс. руб., якая забраніравана выключна для продажу замежным спэцыялістам. Пры рэалізацыі іры толькі для гэтых спэцыялістаў яе хопіць на 6 з пал. год. Камэрцыйны абутак на 26 тыс. руб. на віцебскім складзе ляжаў бяз руху больш месяца. І толькі калі ўмяшаліся органы РСІ, ён быў пушчан у продаж.

У гэтых фактах (а іх можна было-б прывесьці значна больш) выяўляецца, як праяўлены «лепшанскага духу», гандлярскае імкненьне пачакаць «лепшай кан'юнктуры рынку», так і «лявацкага» варыянту тэндэнцый, якія выяўляюцца ў нежаданьні выканаць рашэньні работніцкай перайсьні з роёх мэханізмаў размеркаваньня тавараў на рэйкі разгорнутага савецкага гандлю.

Сярод прычын, што перашкаджаюць замарожваньне тавараазвароту, поўнае выкананьне заданьняў па **«адмаўленьні гроша»**, месца займае нізкая якасьць планаваньня.

Дрэннае плянаваньне па сыстэме спажыўкаапэрацыі прывяло да перапукі пасобных раёнаў і каапэратыўных арганізацый некаторымі таварамі пры адсутнасьці іх у другіх месцах. Толькі з гэтай прычыны ў Мазыр, напрыклад, завезена 18 вагонаў соли пры месячнай патрэбе ў 1 з пал. вагона. У гэтым-жа раёне на складах выявілася на 4 тыс. руб. цукру пасьля поўнай выплаты пайкоў за 4 квартал. Пры вызначнай колькасьці чаю ў гаралах БССР у Рэчыцы яго ёсьць на 5 з пал. тыс. руб.

Аналіз тавараных астач паказвае, наколькі ня роўнамерна насычаны раёны таварамі. Няўважлівыя адносіны да асартыменту ў злучэньні з недапушчальна нізкай і ў радзе выпадкаў злачынна дрэннай якасьцю плянаваньня ствараюць напружанае фінансавае становішча каапэратыўна-гандлёвых арганізацый асобных раёнаў пры адсутнасьці, або зусім незначнай колькасьці такіх нават непадфінытных тавараў, як соль, запалкі, пасярэсы ў іншых раёнах.

Ажыцьцяўленьне па ўсёй сыстэме такой важнейшай задачы як гаспадарчы разрахунак знаходзіцца ў поўнай сувязі з якасьцю плянаваньня. Дрэннае плянаваньне — вораг гаспадарчага разрахунку.

Відавочна, што задачу павышэньня якасьці плянаваньня і паляпшэньня асартыменту патрэбна паставіць, як важнейшую ў разгортваньні тавараазвароту.

Толькі апартуністы могуць недаацэньваць плянаваньня, асартыменту, імкнаваць заматрабаваньні спажыўца, адносіцца абыкі да замарожваньня тавараазвароту.

Троба рашуча біць па ўсякіх імкненьнях узгоднець замарожваньне тавараазвароту і тлумачыць гэта разгорнутага савецкага гандлю.

Сярод прычын, што перашкаджаюць замарожваньне тавараазвароту, поўнае выкананьне заданьняў па **«адмаўленьні гроша»**, пераходзе да простага «прадукта абмену» і г. д.

ХVII партканфэрэнцыя ў сваёй рэзалюцыі з усёй рэзкасьцю паркрэсьлівае «антыбальшавіцкі характар «лявай» фразы аб пераходзе да «прадуктаабмену» і аб «адмаўленьні гроша» на данай стадыі будаўніцтва сацыялізму».

Рашучая барацьба з падобнага роду скажэньнямі лініі партыі зьяўляецца неабходнейшай умовай разгорнутага культурнага савецкага гандлю.

З другога боку, патрэбна бязьлітасна змагацца з праяўленьнямі «непманскага духу», са спакусьліўнымі гандлярскімі тэндэнцыямі, якія ідуць па лініі скажэньня прынцыпу гаспадарчага разрахунку і растрашэньня дзяржаўных рэсурсаў.

Гэтыя тэндэнцыі знайшлі сваё яркае праяўленьне ў **адвольным узуваньні некаторымі арганізацыямі цэн,** у падмене самазагатовак і нэплянавых закупак рознага роду перакупчаўнымі апэрацыямі з прымусовым асартымэнтам, што ў сваю чаргу прыводзіць да дубляваньня і замарожваньня тавараазвароту, да росту надзнак і г. д.

Разгортваньне самазагатовак і нэплянавых закупак мае вялізарнае значэньне для павялічэньня тавараазвароту і паляпшэньня рабочага спабжаньня. У гэтай галіне дасягнуты пакуль што першыя посьпехі. У гістарэсах далейшага паляпшэньня спабжаньня рабочых патрэбна ўсямерна заахвочваць і разьвіваць праяўленьне ўласнай ініцыятывы ў выглядзе самазагатовак. І тым больш посьпехі ў гэтай важнейшай рабоце будуць заазваны, чым больш жорсткай будзе барацьба супроць спэкулянцкіх нэпманскіх тэндэнцый, супроць скажэньняў прынцыпу гаспадарчага разрахунку, супроць простых тавараабменных апэрацый.

Іншы па шляху паскорэньня необходных умоў для скасаваньня «дэфіцыту» і г. д.

ХVII партканфэрэнцыя ў сваёй рэзалюцыі з усёй рэзкасьцю паркрэсьлівае «антыбальшавіцкі характар «лявай» фразы аб пераходзе да «прадуктаабмену» і аб «адмаўленьні гроша» на данай стадыі будаўніцтва сацыялізму».

Рашучая барацьба з падобнага роду скажэньнямі лініі партыі зьяўляецца неабходнейшай умовай разгорнутага культурнага савецкага гандлю.

З другога боку, патрэбна бязьлітасна змагацца з праяўленьнямі «непманскага духу», са спакусьліўнымі гандлярскімі тэндэнцыямі, якія ідуць па лініі скажэньня прынцыпу гаспадарчага разрахунку і растрашэньня дзяржаўных рэсурсаў.

Гэтыя тэндэнцыі знайшлі сваё яркае праяўленьне ў **адвольным узуваньні некаторымі арганізацыямі цэн,** у падмене самазагатовак і нэплянавых закупак рознага роду перакупчаўнымі апэрацыямі з прымусовым асартымэнтам, што ў сваю чаргу прыводзіць да дубляваньня і замарожваньня тавараазвароту, да росту надзнак і г. д.

Разгортваньне самазагатовак і нэплянавых закупак мае вялізарнае значэньне для павялічэньня тавараазвароту і паляпшэньня рабочага спабжаньня. У гэтай галіне дасягнуты пакуль што першыя посьпехі. У гістарэсах далейшага паляпшэньня спабжаньня рабочых патрэбна ўсямерна заахвочваць і разьвіваць праяўленьне ўласнай ініцыятывы ў выглядзе самазагатовак. І тым больш посьпехі ў гэтай важнейшай рабоце будуць заазваны, чым больш жорсткай будзе барацьба супроць спэкулянцкіх нэпманскіх тэндэнцый, супроць скажэньняў прынцыпу гаспадарчага разрахунку, супроць простых тавараабменных апэрацый.

Іншы па шляху паскорэньня необходных умоў для скасаваньня «дэфіцыту» і г. д.

Аднак, дасягнутае ня можа ісьці ў параўнаньне з тым, што патрэбна і можна было прарабіць.

Рост лёгкай індустрыі, сацыялістычнае разьвіцьцё сельскай гаспадаркі сыстэматычна павялічваюць нашы таварныя фонды. Расьце колькасьць сетка магазынаў, ларкоў і г. д. Усё гэта стварае неабходныя ўмовы для ажыцьцяўленьня гістарычных пастаноў ХVII усесаюзнай партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б.

Ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых у гэтых пастановах, дыктуе новай хопласьць усямернага разгортваньня тавараазвароту і ў першую чаргу разьвіцьця раздробнага гандлю.

«Толькі на аснове разгортваньня тавараазвароту можна забясьпечыць далейшае хуткае паляпшэньне спабжаньня рабочых і працоўных вёсак прамысловымі таварамі і прадуктамі сельскай гаспадаркі» (рэзалюцыя ХVII усесаюзнай партыйнай канфэрэнцыі).

Бальшавіцкая барацьба партыйных арганізацый і пад іх кіраўніцтвам прафсаюзаў, кансаюзу за паляпшэньне якасьці работы і разьвіцьцё ўласнай ініцыятывы гандлёвых арганізацый, за пашырэньне гандлю калгасаў, саўгасаў, прамаапэрацыяй, абмінаючы лёгкай прамысловасьці, за ўсямернае разгортваньне тавараазвароту, за культурны сэрвіс гандлю—забясьпечыць посьпехі ў выкананьні гэтых важнейшых задач.

Месячнік дарожнага будаўніцтва

Правільная расстаноўка і скарыстаньне рабгужсілы і мэханізмаў—

асноўныя ўмовы выкананьня пляну дарбудаўніцтва

На пасяджэньні цэнтральнага штабу

На другім пасяджэньні цэнтральнага штабу пры ЦК КП(б)Б па правяраньні месячніка дапамогі дарбудаўніцтву, якое адбылося 19 лютага, была заслухана справаздача старшыні Смаляніцкага РВК тав. Казінцова.

Са справаздачы выявілася, што ў пытаньні размеркаваньня фурманак калгаснага і аднаасобнага сэктару пануе поўная блытаніна. Кожная з арганізацый, якой патрэбны фурманкі (леспрамгас, Белторф, Белдарбуд, Галоўдартранс), складаюць павялічаныя пляны на фурманкі. Дрэнна вядзецца ўлік выяжджаючых на працу фурманак і іх прадукцыйнасьці.

Дарожная інстанцыя да 7-га лютага не адкрывала кар'ераў, чакаючы заключэньня дарожнага інстытуту, хоць ёй і вядомы былі плянцоўкі, на якіх павінны быць адкрыты кар'еры.

Штаб прапанаваў Шаркамцрацы выслаць у раёны сваіх прадстаўнікоў, арганізацыям даваць заяўкі на фурманкі толькі выходзячы з рэальных магчымасьцяй раёну.

Белдарбуду і Галоўдартрансу прапанавана максымальна скарыстаць свой гужавы і аўтатранспарт, а таксама шляхам правільнага і своечасовага ўліку дабіцца большай эфэктыўнасьці працы сялянскіх фурманак.

Усебеларуская канфэрэнцыя саюзу чыгунпортшасбуду мабілізавалася на барацьбу за плян дарбудаўніцтва

Усебеларуская канфэрэнцыя рабочых шасэйнага, портавага і чыгуначнага будаўніцтва, якая адбылася ў гор. Гомелі адзначыла рад посьпехаў у выкананьні дарбудпляну 1931 году і вызначыла практычныя мерапрыемствы, якія павінны забясьпечыць выкананьне пляну 1932 г.

Дзякуючы правільнаму скарыстаньню рабочай і гужавой сілы, ажыцьцяўленьню шасьці сталінскіх умоў, праявленьню рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў Заходняя чыгунка з'эканоміла каля 5 млн. руб. Вырасла колькасьць геодэзічна-разрахунковых брыгад на дарожным будаўніцтве. На 1 кастрычніка 1931 году было 97 гаспадарча-разрахунковых брыгад, а зараз іх 423 з ахопам 8.400 чал.

На курсах тэхнікаў займаецца 185 чалавек, на курсах дзесятнікаў—210 чал. Арганізаваны 23 тэхнічныя гурткі, дзе навучаецца 214 чал. Недахват кваліфікаваных дарожных работнікаў патрабуе яшчэ больш хуткага фарсаваньня падрыхтоўкі кадраў і аўладаньня тэхнікай.

Есьць значны зрух у палепшэньні эбслугоўваньня рабочых. Арганізавана 117 магазынаў закрытага тыпу, 67 пастаянных сталовак і 36 перасоўных.

Канфэрэнцыя закастрыла ўвагу на пытаньні барацьбы за плян дарбудаўніцтва 1932 году. Плян мінулага году ня выканан галоўным чынам з прычыны адсутнасьці перабуповы работы ў адпаведнасьці з 6 указаньнямі тав. Сталіна. Галоўдартранс заключыў дагаворы з калгасамі і саўгасамі на рабочую сілу толькі фармальна і ня цікавіўся, як яны выконваюцца. Гэтым можна растлумачыць, што рабсілаю Галоўдартранс быў забясьпечан толькі на 50 проц. У рабоце панавала абыяліччка, безадказнасьць. Усе гэтыя недахопы павінны быць уліканы ў бягучым годзе, каб іх не паўтараць.

Дэлегаты канфэрэнцыі абвясьцілі сябе мабілізаванымі на барацьбу за плян 1932 году, на баявое прыняцьцё месячніка дапамогі дарбудаўніцтву. Сваім прыкладам яны прыцягнуць усю масу работнікаў дарбудаўніцтва.

З. С.

Мэханізмы не скарыстоўваюцца

Кіраўніцтва 5-га вучастку не забясьпечыла выкананьня пляну пабудовы тракту. Работы дзягтворваюцца чацьвёртай марудна. Галоўная прычына—невыкарыстаньне мэханізмаў. З тэпці камплектаў скарыстоўваецца толькі 2 і то пяпоўнасьцю. Замест 4-5 кбм. у гадзіну выробляецца толькі 4 кбм. у дзень. Спэцыялісты, якія спрацуюць па набутае не знаходзяцца на гэта ўвагі. Мэханік **Субаў** замест дапамогі ў рабоце, займаецца п'янствам. Па недагаворанасьці шкраба з начальнікам аўтатрасу 4-га лютага не працавала 8 машын, 8-га лютага — 12 машын. У гэтніку са студзеня месяца прастой складаець 900 гадзін.

Патрэбен рашучы перагром на будаўніцтве. Парт'ячэйка і прафсаюзная арганізацыя павінны разгарнуць сапраўдніцтвае спаборніцтва на вучастку, забясьпечыць поўнае скарыстаньне мэханізмаў, рэалізацыю 6 чмоў тав. Сталіна. Плян будаўніцтва павінен быць выкананы, для гэтага ёсьць усе необходныя ўмовы.

К. У.

Быхаўскі РВК ня мае часу

Быхаўскі райвыканком да апошняга часу не аддаваў патрэбнай увагі выкананьню дарожнага будаўніцтва. Між тым дарогі ў раёне падзвычай дрэнныя. Есьць такія тракты, па якіх толькі зімой можна праехаць і то ў добры мароз. Асабліва дрэнная дарога па тракту Тошчыца-Пасіны Тростаўшчына-Прапойск і Стары-Быхаў-Чыгірынка.

Падрыхтоўка да порбудаўніцтва праводзіцца надзвычай слаба. Зусім асутнічае необходнае для будаўніцтва жалеза. Дрэнна таксама стаіць справа з загатоўкай і вывазкай леса матар'ялаў. Быхаўскі леспрамгас не выконвае дарожнага пасьпектарыту.

Янук.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа—прыватніку" (ЦК УсеКП(б)

Старадароскія арганізацыі супакоіліся НА... 47,8 ПРОЦ. ВЫКАНАНЬНЯ ЗБОЖЖАЗАГАТОЎЧАГА ПЛЯНУ

Самы адсталы ў рэспубліцы

СТАРЫЯ ДАРОГІ.

Тэмпы збожжазагатовак у Старадароскім раёне ўсё яшчэ застаюцца недапушчальна павольнымі. Ня глядзячы на тое, што раён па збожжазагатоўках зьяўляецца самым адсталым у рэспубліцы, мясцовыя арганізацыі ня ўжываюць ніякіх захадаў, каб узмацніць кампанію і ліквідаваць адставаньне. У выніку на 15 лютага гадавы збожжазагатоўчы плян выкананы усяго на 47,8 проц. (без памольнага збору).

Яшчэ горшыя паказальнікі па загатоўках асноўных харчовых культур. Па жыце плян выкананы на 26,1 проц., па пшаніцы—на 16,7 проц.

У пасобных сельсаветах, замест баявой арганізацыі збожжазагатовак, займаюцца разважаньнямі аб «нерэальнасьці» плянаў. Сакратар Горкаўскай парт'ячэйкі **Амяльчэня** лічыць, што «плян выканаць немагчыма». Сакратар **Язынскай парт'ячэйкі Міхейчык** заяўляе: «будзе добра, калі мы выканаем плян на 80 проц.».

Такія апартуністычныя настроі назіраюцца і ў пасобных раённых арганізацыях. Райкалгасаюз, напрыклад, лічачы плян нерэальным, зьменшыў яго на 44 тоны.

Паколькі «выразна» працуюць пасобныя сельсаветы, сьведчыць той факт, што Старадароскі сельсавет давёў плян збожжазагатовак да вёсак толькі 10 лютага. Пасецкі сельсавет абмежаваўся толькі фармальным давядзеньнем пляну загатовак да вёсак, не правёўшы ніякай работы для яго выкананьня.

Кіраўніцтва **Язінскім, Пасецкім, Горкаўскім** сельсаветамі не націскае на кулацтва, прымірэнча адносіцца да сабатажу збожжазагатовак. Такія-ж факты ёсьць і ў іншых сельсаветах. У выніку — цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак у раёне спагнаны ўсяго на 34 проц.

У асобных сельсаветах дапушчаны «лявацкія» загібы, якія выявіліся ў правядзеньні сыстэматычных вобыскаў у серадняцкіх гаспадарках і прымусовага спагнаньня з іх збожжа. У вёсцы Новыя Дарогі прадстаўнікі РК КП(б)Б і РВК Гомза і Залесіп правялі вобыскі ў бядняцкіх і ў серадняцкіх гаспадарках. Члены Новадароскай парт'ячэйкі Мельнікаў і Баханович за няздачу збожжа дзяржаве штрафавалі серадняцкія гаспадаркі.

Старадароскі раён павінен у бліжэйшыя дні выйсьці з глыбокага тылу збожжазагатоўчай кампаніі. Раён мае ўсе магчымасьці поўнасьцю выканаць плян загатовак. Для гэтага трэба толькі забясьпечыць сапраўды бальшавіцкае кіраўніцтва кампаніяй, мабілізаваць масы калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў на поўнае выкананьне абавязацельстваў перад пралетарскай дзяржавай.

Неадкладна і поўнасьцю павінны быць спагнаны пэвёрлыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак. Патрэбна моцна ўдарыць па канкретных посьпітах правай практыкі і «лявацкіх» антысерадняцкіх загібаў.

Нарэшце, раённыя арганізацыі абавязаны рашуча паленшыць якасьць загатовак, г. зн. узмацніць загатоўкі харчовых культур (жыта і пшаніцы).

М. Галін.

Рагачоўшчына недадала дзяржаве 650 тон збожжа

РАГАЧОЎ.

На 15 лютага гадавы плян збожжазагатовак па Рагачоўскім раёне выкананы на 75 проц. Раён недадаў дзяржаве 650 тон збожжа. Гэта ганебнае адставаньне зьяўляецца вынікам слабай апэрацыйнай работы часткі сельсаветаў, няўменьня мабілізаваць масы калгаснікаў і аднаасобнікаў—беднякоў і сераднякоў — на поўнае выкананьне і перавыкананьне заданьняў па збожжа.

Дзе-ні-дзе яшчэ існуюць апартуністычныя разважаньні аб «нерэальнасьці» плянаў. Гэтыя разважаньні, за якімі на справе хаваецца нежаданьне па-бальшавіцку арганізаваць збожжазагатоўкі, разьбіты пашчэнт перадавымі сельсаветамі, якія выканалі і перавыканалі збожжазагатоўчыя пляны. Доўскі сельсавет выканаў заданьне па калгасным сэктары на 158,6 проц., па аднаасобным — на 100 проц.; Запольскі сельсавет аднаведна — 110,7 проц. і 112 проц.; Стаўпінскі — 101,5 проц. і 101,4 проц.; Старасельскі — 150,9 і 101 проц.

Вопыт работы перадавікоў, аднак, не перанесен у адсталы сельсаветы, дзе заданьнаў ня выканалі ні калгасы, ні аднаасобны сэктар. Да гэтых сельсаветаў адносяцца: Гарадзецкі (калгасы — 19,1 проц., аднаасобны сэктар — 65,7 проц.); Збароўскі (калгасы — 92,1 проц., аднаасобны — 28,6 проц.); Курганскі (калгасы — 60,8 проц., аднаасобны — 66,9 проц.) і інш.

Крутое павышэньне тэмпаў загатовак — гэта важнейшая ўмова лепшай падрыхтоўкі да весенняй пасоўкампаніі.

За 20 дзён—0,4 проц. пляну

ЧЭРВЕНЬ.

За апошні час загатоўчыя арганізацыі амаль зусім спынілі збожжазагатоўкі. Калі за 25 студзеня плян па раёне быў выкананы на 72,2 проц., дык на 15 лютага ён выкананы усяго на 72,6 проц. Такім чынам за чатыры нядзелькі прырост складае ўсяго... 0.4 проц.

Рудзянскі, Раваніцкі і Грабянецкі сельсаветы за апошні час не загатовілі ні аднаго кілёграма збожжа.

Калгасны сэктар раёну выканаў плян на 99,1 проц. У абозе цягнецца індывідуальны сэктар. Адзай з істотных прычын адставаньня зьяўляючца тамабілізацыйныя настроі, якія існуюць сярод пасобных адказных работнікаў у раёне і сельсаветах. Старшыня райкаапсаюзу на пытаньне, што ён мяркуе зрабіць для ўзмацненьня збожжазагатовак, заявіў проста — «нічога».

Гэтыя настроі павінны сустрэць бязьлітасны адпор з боку кіруючых раённых арганізацый.

Я. Балн.

В. САМУЦІН

За ўсямернае разгортваньне і паскарэньне тавараазвароту

У выкананьні задач 1932 году, у рэалізацыі пляну другой пяцігодкі надзвычай важную ролю павінен адыграць савецкі гандаль.

Гэта вынікае, па-першае, з таго, што разгортваньне савецкага гандлю зьяўляецца важнейшым стымулам для вынаходніцтва ня ўсіх у нашай гаспадарцы вялізарных і далёка яшчэ ня выкарыстаных унутраных рэсурсаў, якія апрыяюць паскарэньню росту сацыялістычнага накапленьня» (з рэзалюцыі ХVII усесаюзнай партканфэрэнцыі).

Надзвычай важным фактарам, які вызначае ролю савецкага гандлю зьяўляецца задача разкага павышэньня ў 2-3 разы норм душавога спажываньня прадуктаў лёгкай і харчовай прамысловасьці да канца другой пяцігодкі.

Даныя аб выніках і перспэктывах разьвіцьця прамысловасьці, аб росьце сацыялістычнай сельскай гаспадаркі паказваюць, якія вялізарныя масы тавараў павінна праводзіць наша каапэрацыйная і дзяржаўная гандлёвая сетка.

Наркамснабаўская прамысловасьць нашай рэспублікі ў 1927-28 г. г. выпусьціла прадукцыі на 17,3 млн. руб., у 1929-30 г. г.—на 39,2 млн. руб., а ў 1931 г.—на 70,9 млн. руб. Каапэрацыйная прамысловасьць у 1928-29 г. г. дала прадукцыі на 34.8 млн. руб., у 1929-30 г. г.—на 77.2 млн руб., а ў 1931 г.—на 138,7 млн. руб.

Яшчэ больш значныя і надзвычай цікавыя зьяўляюцца лічбы, прыведзеныя тав. Арджанікідзе ў закладзе на ХVII партканфэрэнцыі. Абутку скуранога прамысловасьць СССР выпусьціла ў 1931 г. 76,8 млн. пар. ў той час, як у 1913 г. яго было выпушчана 8,4 млн. пар і рахам з саматужнай прамысловасьцю—16,9 млн. пар. Галёш гумовых—53,9 млн. пар, мыла гаспадарчага—182 тыс. тон. І таго і другога ў два разы больш, чым выпускалася ў даваенны час.

Аднак, усяго гэтага аказалася мала для таго, каб задаволіць гігантска ўзросшы попыт на такія рэчы, як галёшы, мыла і інш. Гэтыя рэчы ў царскай Расіі ня былі даступнымі для шырокіх працоўных мас, як недаступны і зараз для працоўных мас капіталістычных краін.

Гэтыя факты надзвычай выразна паказваюць, наколькі вырасла пакупная здольнасьць, наколькі палепшылася матар'яльнае становішча шырокіх мас Савецкага Саюзу.

Лінія нашай партыі, практычныя задачы, што стаяць у 1932 годзе і ў другой пяцігодцы, накіраваны на поўнае задаваленьне патрэб працоўных, на яшчэ большае павышэньне іх матар'яльна-бытавога ўзроўню.

Валавая прадукцыя прамысловасьці БССР (якая ў асноўным зьяўляецца прамысловасьцю лёгкага тыпу) павінна ў 1932 годзе ўзрасьці на 52,1 проц. супроць 1931 г., што перавышае заданьне апошняга году пяцігодкі на 22,3 проц. Лёгкая індустрыя ўсяго Саюзу павінна даць прыросту 29 проц. і харчовая прамысловасьць Наркамснабу—на 36 проц. У 1932 годзе значна вырасьце таварная прадукцыя саўгасаў і калгасаў.

Давесьці гэтыя вялізарныя таварныя масы да працоўнага спажыўца з усіх яго запатрабаваньняў, з усіх асартыменту, давесьці без спрат у максымальна кароткі тэрмін—важнейшая задача каапэрацыйна-гандлёвай сеткі.

Тут на першы плян высоўваецца пытаньне тавараазвароту. Ушчыльненьне тэрэнаў збору тавараў і колькасны яго рост важныя ня толькі з пункту погляду «вуліц» нашага савецкага гандлю. Тавараазварот мае вялізарнае значэньне для работы прамысловасьці. Хуткі зварот тавараў спрыяе росту сацыялістычнага накапленьня. Замарожваньне тавараазвароту б'е ня толькі па рабочым спажыўцы, па якасьці тавараў, але паболь ле прамысловасьць пэўнай колькасьці сродкаў у выглядзе павышэньня выдаткаў па звароце.

Важнасьць гэтай акалічнасьці, неабходнасьць паскарэньня і ўсямернага разгортваньня тавараазвароту далёка ня ўсюды і ня ўсамі кіруючымі каапэрацыйна - гандлёвымі арганізацыямі ўсьвядомлена. У цэлым радзе зьвеньняў як спажыўкаапэрацыі, так і дзяржаўнага гандлю нашай рэспублікі да апошняга часу маюць неспа фэкты злачыннага замарожваньня тавараазвароту і другога роду скажэньня прынцыпаў савецкага гандлю.

Незадавальняючая работа тавараправодзячай сеткі БССРідзе з таго, што плян тавараазвароту за 1931 г. па сыстэме спажыўкаапэрацыі выкананы на 86,3 проц., прычым на вёсцы плян рэалізован усяго на 78 проц. Яшчэ горш па лесасэкцыі, якая дала толькі 52 проц. пляну. Выпачаны ліміты колькасьці дзён для абароту тавараў скорэн і ўсюды, як правіла, неразвіваюцца. Па вясковай сетцы яны, напрыклад, даходзяць да 30 супроць устаноўленых 16 дзён.

Гэта ўказвае на марудлівасьць у перабудове работы, слабасьць барацьбы з урачыстлівасьцю і абязьлічкай у каапэрацыйным апараце, у апараце масавынаў, складаў і адсутнасьць дзейснага, асабліва па вясковым сэктары, кантролю рублём.

Правяроная ЦКК КП(б)Б у сьнежні 1931 году праверка тавараў астач выявіла цэлы рад істотных фактаў замарожваньня тавараазвароту. Пры ўмовах нехапкту тавараў аказалася замарожанымі па сыстэме спажыўкаапэрацыі на 8 млн. руб., па Беларусі — на 1.400 тыс. руб. тавараў. Прычым на вялікую сумму замарожаны яўраз тыя тавары, на якія адчуваецца вялікая патрэба. Напрыклад, гатовага адзеньня—на 2.049,3 тыс. руб., абутку—на 1.097,3 тыс. р. і г. д.

Пад відам браніраваньня фондаў і па-іншых прычынах асобныя каапэратыўна-гандлёвыя арганізацыі імкнуцца стварыць запас тавараў для таго, каб опусьціць іх пры «выгоднай кан'юнктуры рынку». Гэта ў першую чаргу адносіцца да лесасэкцыі, якая значна недавыконвае тавараазвароту і ў той-жа час мае замарожаных тавараў па 1.780 тыс руб.

Па віцебскім лесрабкопе, напрыклад, астача тавараў складае 36-дзённы запас замест пляновых 16 дзён. Такія востра-дэфіцытныя тавары, як гатовая вопратка і абутак, рэалізуецца лесрабкопам з выключнай марудлівасьцю.

Тое-

Японскія войскі ў Шанхаі падрыхтаваліся да атакі

З Эўропы бесьперапынна плывуць для Японіі ваенныя грузы

Японскія патрабаваньні адкінуты

ШАНХАЙ, 18. Як паведамляюць, перагаворы паміж японцамі і кітайскім камандаваньнем пераРваны з прычыны нагрымаваньня кітайцамі японскіх патрабаваньняў, якія заключаліся ў наступным: разьвесьці усынскія форты і форты «Львіных узгораў» (каля Нанкіну) і эвакуаваць войскі з Шанхаю. Пасьля таго, як японцы пераканаюцца ў тым, што кітайскія войскі эвакуяваці, японскія войскі часьці таксама будуць выведзены з абароннай зоны ўнутры сэтльмэнту.

Сёньня ночу японцы перадалі кітайскаму камандаваньню ноту, зьмест якой невядомы. Мяркуюць, што гэта нота зьяўляецца ультыматумам.

Канцэнтрацыя кітайскіх сіл

ШАНХАЙ, 19. Паведамляецца, што ў Шанхай прыбылі значныя кітайскія сілы пад камандаваньнем старшыні правінцыяльнага ўраду Цзянсу Ку Цзо-тун. Апрача таго войскамі Чжан Цзінь-цьзяна, якія знаходзяцца ў правінцыі Цзянсу, загалава прасунуцца ў Чапэй. Абвешчана, што гэтыя войскі пойдуць на дапамогу 19-й армії. Англельскі і амэрыканскі консулы далі распараджэньне англельскім і амэрыканскім грамадзянам бездакладна эвакуавацца з раёну Янцззіну і Хэньню ў больш бясьпечныя месцы.

Японцы не абмяжуюцца 20-цімільнай зонай

ШАНХАЙ, 19. Японскія ўлады заявілі, што калі кітайскія войскі ня будуць адведзены да 7 ГАДЗ. ЗАЎТРАШНЯЙ РАНІЦЫ, яны будуць лічыць тэрмін ультыматуму МІНУЎШЫМ. Пры гэтым японскія ўлады заявілі, што ў сваіх дзеяньнях яны НЯ БУДУЦЬ АБМЯЖОЎВАЦЦА 20-ЦІМІЛЬНАЙ ЗОНАЙ, А КАЛІ ТРЭБА БУДЗЕ, АДСУНУЦЬ КІТАЙСКІЯ ВОЙСКІ ДАЛЕЙ.

Мабілізацыя Японіяй 6-й дывізіі

ШАНХАЙ, 18. У добра праінфармаваных колах сьцьвярджаюць, што японскія ўлады прыступілі да мабілізацыі 6-й дывізіі, раскватараванай у Кумота (буйны горад на востраве Кіў-Сіў). Дывізія будзе адпраўлена ў Шанхай, куды прыбылі ўжо 2 дывізіі ў складзе 30 тысяч штыхоў.

Паведамленьне Сімбун Рэнга

ТОКІО. Сімбун Рэнга паведамляе з Цзяньдзіна быццам кітайскія войскі вечарам 17-га лютага раптам адкрылі агонь па наступаючых на вуліцы японскіх войсках. Японскія ўлады заявілі рашучы пратэст мэру Цзяньдзіна. Перагаворы па гэтым пытаньні пачаліся ўчора.

Кітайская дэлегацыя стукаецца ў дзьверы Лігі нацый

ЖЭНЭВА, 19. (Спец. кар. ТАСС). Кітайская дэлегацыя патрабавала скліканьня пасяджэньня рады Лігі нацый, матывуючы патрабаваньне НОВЫМ ЯПОНСКІМ УЛЬТЫМАТУМАМ У ШАНХАІ.

Прыстасаваньне мер да Японіі было-б „неразумным і вельмі небясьпечным"

ЛЕНДАН, 19. Лёрд Хэйлшэм (ваенны міністар і лідэр кансэрватараў у палаце лёрдаў) заявіў, што, «у мэтах абароны сэтльмэнту, англельскія ваенныя і марскія сілы ў Шанхаі зараз павялічаны і складаюцца з 4 брэйсэраў, і зьнішчальніка, і кананэркі, 4 батальёнаў пяхоты і батарэі конных артылерыстаў».

На пытаньне Поксонбі аб прыняцьці эканамічных і палітычных санкцый у адносінах да Японіі, якая па думцы Поксонбі парушыла 16 артыкул статуту Лігі нацый, Хэйлшэм адказаў, што прыняцьце падобных мер было-б «неразумным і вельмі небясьпечным», бо ў гэтым выпадку агонь варожых дзеяньняў на Далёкім Усходзе значна пашырыўся-б.

Новы пратэст ангельскай упады

ЛЕНДАН, 18. Два ангельскіх матросы, параненыя ўчора кітайскай гранатай, памёрлі. У сувязі з гэтым інцыдэнтам, ангельскія ўлады вызырнулі з вельмі пратэстамі як да японцаў, так і да кітайцаў. Да першых на тэй падставе, што японцы, скарыстоўваючы сэтльмэнт як базу для ваенных аперацый, стварылі пагрозу для жыцьця і бясьпечнасьці ангельскіх грамадзян, да других — паколькі ангельчыная пагроза стварэньня ў рэкуляцыне артылерыйскага агню кітайцаў. Як паведамляюць з некаторых крыніц, Англія патрабуе ад кітайскага ўраду пробачэньня і кампэнсацыі за загібель двух маракоў.

Надыходзячая атака будзе больш зьнішчальнай чым ранейшая

ШАНХАЙ, 19. Пашыраюцца паведамленьні, што японскія аэраплены будуць скідаць бомбы з атрутнымі газамі і што надыходзячая атака Нанкіну будзе больш зьнішчальнай, чым ранейшыя атакі на Чапэй і Усун. У Нанкіне штодзённа вытягваюцца лепшы ка тэму аб мерах супрацьпаветранай абароны. Нанкінскае адзяленьне Гаміндану патрабавала, каб войскі, размешчаныя ў Цзянсі, былі адпраўлены ў Шанхай на дапамогу кітайскім войскам, якія абараняюць горад.

Антыяпонскі байкот-руйнуючы ўдар па экспарце Японіі

ШАНХАЙ, 19. У палітычных колах гаворыць, што шанхайскія падзеі былі ў значнай ступені паскораны пазыцыяй тых пластоў японскай буржуазіі, якія зьвязаны з японска-кітайскім гандлем. Гэтыя колы патрабавалі ад японскага ўраду і ў першую чаргу ад кіраўніцтва ваеннага ведамства прыняцьця эфэктыўных мер для задушэньня антыяпонскага байкоту ці ажыцьцяўленьня «гапаровага адступленьня» шляхам перагаворaў з Нанкінскім урадам.

Антыяпонскі байкот, які значна ўзрос пасьля Манчжурскага канфлікту, прынёс вялізарныя страты Японіі. Паводле даных японскага міністэрства гандлю, экспарт Японіі ў Кітай складаў у 1931 г. 155 млн. ien, скарацілься на 40 проц. ў параўнаньні з 1930 г. і на 55 проц. ў параўнаньні з 1929 г. Японскія экспарцёры моцна заклапочаны тымі акалічнасьцямі, што **Англія заняла другое месца сярод імпарцёраў у Кітай, выціснуўшы Японію.** Антыяпонскі байкот адбіўся таксама на японскім імпарце з Кітаю. Спыніўся ўвоз кітайскага зерня, якое служыць асноўным кормам для буйной рагатай жывёлы ў Японіі. Тое-ж самае адносіцца да масьляністага насеньня, якое ўвозіцца з Шанхаю, а таксама да некаторых іншых катэгорый сырцу. Антыяпонскі байкот значна абвастрыў крызіс японскага парахоцтва, якое страціла за 4 апошнія месяцы 1931 г. звыш 100 млн. ien.

Заява Аракі

„Японскія войскі бездакладна прыступяць да ваенных дзеяньняў"

ТОКІО, 19. На пасяджэньні рады міністраў Аракі (вайсковы міністар Японіі) паведаміў, што адказ на ультыматум чакаецца да 7 гадз. раніцы 21-га лютага. У выпадку адхіленьня японскіх патрабаваньняў, японскія войскі бездакладна прыступяць да ваенных дзеяньняў. Аракі лічыцца з магчымасьцю ўзьнікненьня «сур'ёзных абставін» у сувязі з набліжэньнем войск Нанкінскага ўраду да Шанхаю і Сучжоу.

Дэкларацыя аб стварэньні „незалежнай Манчжуры"

БЭЙПІН, 16. У Мукдэне Паўночна-ўсходнім выканаўчым камітэтам апублікавана дэкларацыя аб стварэньні «ўраду незалежнай Манчжуры і Манголіі». У дэкларацыі гаворыцца, што «ў результаце дакладнага абмеркаваньня — нарада паўнамоцных прадстаўнікоў краю пастанавіла парваць усякую сувязь з былымі посьбітамі ўлады ў Манчжурыі і абʼяднацца ў саюз чатырох вызначаных правінцый Паўночна - Усходняга краю. Адміністрацыйны камітэт будзе выканаўчым органам новай улады. Улада будзе кіравацца наступнымі прынцыпамі: «выкарчоўваньне мілітарысцкіх клік, адмаўленьне ад антыкітайскай палітыкі шанінізму, ажыцьцяўленьне прынцыпу атрымныя дзьвярэй і роўных магчымасьцяй, замацаваньне законнасьці». Апрача адміністрацыйнай, заканадаўчай і кантрольнай палат, арганізаваны вярхоўны савет па ўзоры тайнага савету Японіі. Палаты падпарадкаваны вярхоўнаму кіраўніку. У канцы лютага ў Чаючуне адбудзецца новая канфэрэнцыя выканаўчага камітэту для фармальнага абраньня прэзыдэнта і прынцыпа «канстытуцыі».

Амэрыка зьбіраецца паслаць Японіі новую ноту

ВАШЫНГТОН, 18. Паводле вестак дзярждэпартамент абмяркоўвае пытаньне аб пасылцы Японіі ноты, у якой яна будзе папярэджана, што ПАЗШ патрабуюць фінансавай кампэнсацыі за страту, зробленую жыцьцю і маёмасьці амэрыканскіх грамадзян у Шанхаі. Чуткі аб намеры Японіі акупаваць Чапэй выклікаюць заклапочанасьць.

ПАЗШ адмаўляюцца прызнаць „незалежную Манчжурыю"

ВАШЫНГТОН, 18. У сувязі з паведамленьнямі аб пальходзячым абвяшчэньні «незалежнай Манчжуры» і стварэньні ўраду «незалежнай Манчжуры», дзяржаўны дэпартамент заяўляе, што **ПАЗШ адмовяцца прызнаць «незалежную» Манчжурскую дзяржаву** ў адпаведнасьці з нотай Стымсона ад 7-га студзеня.

Крывавы японскі тэрор ў Манчжурыі

БЭРЛІН, 14. Карэспандэнт «Нэйе Цурыхэр Цайтунг», які знаходзіцца ў Кітаі, вядомы журналіст Бастард паведамляе пад загалоўкам «Японскія мэтады пацыфікацыі ў Манчжурыі», што 12 лістапада ў Турэйо пасьля рукапашных бояў паміж японскімі салдатамі і кітайскім грамадзянскім насельніцтвам, японцы заязалі пяць кітайцаў у мяшкі і жывымі закапалі іх у зямлю. 4 студзеня 1932 г. 4 самалёты скінулі на галоўную вуліцу Тукпло 18 бомб, прычым было забіта 20 чал. і зруйнавана 10 дамоў. Між тым прадстаўнік японскага галоўнага камандаваньня напярэдадні заявіў, што самалёты будуць скідаць бомбы толькі на кітайскія бронепаязды. 10 студзеня пасьля пачатка нападу банды былі арыштаваны 65 прыватных грамадзян, з якіх 19 былі бяз сьледзтва расстраляны. У той-жа дзень японскія салдаты зьвязалі і спалілі жывымі трох чалавек, якіх нібы былі злоўлены ў часе нападу банды. Гэты выпадак стаў вядомы таму, што група палонных, якіх хацелі прымусіць даць паказаньні, павінна была прысутнічаць пры гэтай карэ. 14 студзеня Бастард бачыў на месцы, дзе было раскладзена вогнішча, напоўбугляныя чарэпы.

Кітайская армія будзе абараняць кожны вяршок сваёй тэрыторыі

ШАНХАЙ, 19. Цай Цін-най заявіў, што 19-я армія мае ВЫСТАРЧАЛЬНЫ РЭЗЭРВ. Кітайскія ўмацаваньні за час інтэнсыўнай бамбардыроўкі на працягу 3-х тыдняў НЕ ПАШКОДЖАНЫ. Кітайская армія пашырыла лавы фронт, стварыўшы вялікую абаронную лінію ўздоўж дарогі з Шанхаю ў Люхэ. Іншыя пазыцыі ў раёне Цзяньваня, у сувязі з характарам мясцовасьці, амаль НЯПРЫСТУПНЫ для пяхотнай атакі. Дадатковыя ўдарныя войскі занялі ўмацаваньні з мешкоў з пескам.

КІТАЙЦЫ, — заявіў Цай Цін-най, — МАЮЦЬ КАМЕР АБАРАНЯЦЬ КОЖНЫ ВЯРШОК СВАЁЙ ТЭРЫТОРЫІ. Кітайскія салдаты скрыты ва многіх пунктах, так, што японскай авіяцыі ня ўдасца знайсьці мясцазнаходжаньне пазыцый. Старанна замаскаваныя гарматы штодзённа перамяшчаюцца. Сыстэма сувязі паміж акопамі завершана.

Паводле паведамленьняў «ШАНХАЙ ТАЙМС», насуперэка інспіраваным японскімі ўладамі, кітайцы падкладалі міны ў многіх пунктах Чапэю. Напрыклад (раён у кітайскай частцы горада) значна ўзмацоўваецца. Капаюцца акопы блізка да межаў французкай канцэсіі. Устанаўляюцца гарматы. Паводле слоў газэты, прыбыўшыя з Манілы, Малайскіх астравоў і Ўсходняй Індыі кітайцы, паведамляюць, што ў гэтых месцах ствараюцца валянтэрскія атрады. Чатыры такіх атрады накіраваліся ў Кітай, каб уключыцца ў склад дзейнічаючай армії.

Пэнлевзстварае новы габінэт Францыі

ПАРЫЖ, 18. Паводле вестак Гавас, Пэнлев (уваходзіць у склад партыі рэспубліканскіх сацыялістаў, у якой знаходзіцца і Брыян) згадзіўся стварыць новы габінэт. Ён вёў перагаворы з Пяваляем, Тардʼе і Рэйно аб супрацоўніцтве.

У сувязі з заявай Пэнлеве, што ён мае намер пакінуць за сабой пост міністра ўнутраных спраў — Тардʼе, Пяваль і Рэйно вярнулі сабе свабоду дзеяньняў на тэй падставе, што па думцы пераважнай большасьці, пасада міністэрства ўнутраных спраў павінна накіравацца адным з прадстаўнікоў гэтай большасьці.

***

ПАРЫЖ, 8. Пэнлеве прапанаваў Банкуру прыняць пост міністра. Банкур згадзіўся. Адначасова з гэтым Пэнлеве запытаў Брыяна ці можа ён разьлічваць на яго супрацьпасьць.

Прапанова Тардʼе

ПАРЫЖ, 18. Агэнцтва Гавас паведамляе: «Сёньня ў 8 гадз. 30 мін. раніцы ў Елісейскім палацы (рэзыдэнцыя прэзыдэнта рэспублікі) быў Тардʼе, які гутарыў на працягу 1 гадзіны з Думэрам. Па выхадзе з палацу Тардʼе заявіў, што ён паказаў прэзыдэнту на неабходнасьць, улічваючы міжнародное становішча, арабескі ў парляманце бюджэт і зрабіць выбары.

У 10 гадзін у Елісейскі палац прыбыў Пэнлеве, выкліканы сакратаром прэзыдэнта рэспублікі».

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Тэхнічныя паходы

МАСКВА, ЦС ОПТЭ (таварыства пралетарскіх турыстаў) вылучыў 200 рабочых-турыстаў — кандыдатаў і партыйцаў для дасьледчых работ на адпушчаных каляровых мэталяў у розных раёнах Саюзу (Урал, Сярэдняя Азія і інш.).

Турысты—фабзайцы заводу «Авіяпрыбор» арганізуюць паход у Айратыю для адшуканьня новых крыніц сырцу. Пры фабзавучы арганізаваны заняткі па азнаямленьні ўдзельнікаў паходу з геаграфічным і эканамічным становішчам Айратыі.

На рашаючых вучастках

ВУГАЛЬ. 17 лютага па Саюзе здабыта 191.464 тоны вугалю. 18 лютага па Данбасе здабыта 133.745 тон.

МЭТАЛЬ. 16 лютага па Саюзе выплаўлена 14.879 тон чыгуну і 11.662 тоны сталі (без малой мэталургіі).

Выпуск паперы

З 11 па 15 лютага Шклоўская паперовая фабрыка «Спартак» выпрацавала 85,026 тон паперы на суму 48.633 руб. Праграма выканана на 49.37 проц. Прогант прастою—35,7. Прастоі выкліканы недахопам электраэнэргіі, што падзецца БелДРЭС.



Заканчваецца будаўніцтва 3-яй чаргі Балахнінскага камбінату імя Дзяржынскага. Да 1 сакавіка мяркуецца пуск. З увядзеньнем у строй 3 чаргі Балахна будзе даваць 315 тон паперы ў суткі. НА ЗДЫМКУ: агульны выгляд новай залі папяровых машын 3-яй чаргі

Санаторы імя Сталіна

ТЫФЛІС. Агульны сход рабочых Бержомскага клёпачнага заводу пастанавіў набудаваць у Бержоме ў адпаведнасьці 11 гадавіны Савецкай Грузіі санаторы імя Сталіна. Для стварэньня фонду пабудовы санаторыя рабочыя пастанавілі адпрацаваць выхадны дзень 24 лютага і выклікалі ўсе заводы Грузіі.

Работа менскай галянтарэйнай фабрыкі

Галянтарэйная фабрыка «Беларуская» (Менск) за 3 шпіднёўку лютага выканала праграму на 101,2 проц. Грабеньны цэх даў 117,8 проц. заданьня, гузікавы — 83,4 проц. (з-за недахопу дапаможнага матар'ялу).

Выраб цісковуў

Завод «Калунар» (Менск) за 16 і 17 лютага выпусьціў 459 пар цісковуў, месячнае заданьне выканана сумарна на 13 проц., у кольчасным выкананьні — на 12 проц.

Забастоўка польскіх гарнякоў пашыраецца

ВАРШАВА, 19. Забастоўка гарнякоў у Дамброўскім і Кракаўскім басэйнах супроць зьніжэньня зарплаты пашыраецца. Забаставалі таксама грузчыкі вугалю. У радзе месц пад кіраўніцтвам камуністаў адбыліся дэманстрацыі бастуючых. У раёнах, ахопленых забастоўкай, знаходзяцца атрады пешай і коннай паліцыі.

Вячорная газэта «АБЦ» піша, што больш усіх агітуюць за забастоўку жанчыны — жоны гарнякоў. Яны заняліі ўсе ходы капальні і не дапускаюць штрэйкбрэхэраў.

Усе порты паўночнай Эўропы перапоўнены ваенным грузам для Далёкага Усходу

БЭРЛІН, 19. Буржуазная газэта «12 УР БЛЯТ» паведамляе, што УСЕ ПОРТЫ ПАЎНОЧНАЙ ЭЎРОПЫ ПЕРАПОЎНЕНЫ ПАГРУЗКАЙ І ПЕРАГРУЗКАЙ ВАЕННАГА РЫШТУНКУ, ЯКІ НАКІРОЎВАЕЦЦА НА ДАЛЕКІ УСХОД. Па словах газэты САМЫЯ БУЙНЫЯ зьдзелкі па ваенных пастаўках на Далёкі Усход заключаны ў АНГЛІІ. Адгуль накіравана ў КАРЭЮ 9 ПАРАХОДАЎ СА ЗБРОЯЙ І БАЛЕВЫМІ ПРЫПАСАМІ, на агульную суму ў 100 МЛН. МАРАК. Найбольш каштоўная частка гэтых грузаў — ГРАНАТЫ З АТРУТНЫМІ ГАЗАМІ.

З пагрузачных дакумантаў відаць, што ўладарам гэтых грузаў зьяўляецца ЯПОНІЯ. Далей газэта паведамляе, ШТО ГЭТЫЯ ТРАНСПАРТЫ ВАЕННАГА РЫШТУНКУ ДЛЯ ДАЛЕКАГА УСХОДУ ІДУЦЬ ДА ГІБРАЛТАРСКАГА ПРАЛІВУ ПАД АХОВАЙ УЗБРОЕНЫХ СУДНАЎ. У Гібралтары гэтыя судны будуць заменены другімі ахоўнымі суднамі. Усе гэтыя транспарты ідуць не праз Суэцкі канал, а на Далёкі Усход.

АКОЛЬНАЙ ДАРОГАЙ, абʼяжджаючы паўднёвую Афрыку. Робіцца гэта таму, каб ухіліцца на выпадак нагнебудзь нападзьцця з гэтымі суднамі ад РАЗБУРЭНЬНЯ Суэцкага каналу.

Далей газэта паведамляе, што ўжо ў ангельскім порце БЕЛЬФАСЬЦЕ, які зьяўляецца портам адпраўленьня гэтых транспартаў, НА ПАРАХОДЫ СЕЛІ ЯПОНСКІЯ АФІЦЭРЫ. На апошнім адрэзку гэтай дарогі, за паўднёвай Афрыкай, ТРАНСПАРТЫ БУДУЦЬ СУСТРЭТЫ ЯПОНСКІМІ ВАЕННЫМІ СУДНАМІ, ПАД АХОВАЙ ЯКІХ ЯНЫ НАКІРУЮЦЦА ДА МЕСЦА ПРЫЗНАЧЭНЬНЯ.

Ваенныя заказы ў Швэцыі

СТАКГОЛЬМ, 18. Паводле паведамленьня з Осло цьпнамідавая фабрыка ў Одда, на якой вырабляецца хімічныя матар'ялы для ваенных патрэб, атрымала вялікія заказы ад ангельскіх і бальшэвіцкіх фірм для экспарту.

Камфракцыя гамбурскага парляманту выкрывае сацыял-дэмакратычных халуёў Японіі

БЭРЛІН, 19. Учарашнае пасяджэньне гамбурскага парляманту прайшло пад знакам капуністычных выступленьняў супроць адпраўкі праз Гамбург ваеннага рыштунку для Японіі. На запытаньне камфракцыі сацыялдэмакратычнаму начальніку паліцыі Шэнкэльдзэру, адказаў ад імя паліцыі сацыял-дэмакратычны дэпутат Умланд, заявіўшы, што «аб забароненых адпраўках зброі і ваеннага рыштунку нічога невядома». Абмеркаваньне запытаньня камфракцыі было адхілена адзіным фронтам ад сацыялдэмакратаў да фашыстаў.

У часе выступленьня камдэпутата, рабочыя на трыбунах для публікі разгарнулі вялізарны плякат з лёзунгам «Далоў імпэрыялістычную вайну». Завязалася барацьба паміж паліцыяй і рабочымі. Некалькі рабочых паранены. Адначасова з гэтым у рабочых раёнах Гамбургу арыштавана 200 рабочых.

Шматтысячны сход беспрацоўных у Гамбургу паслаў дэлегацыю ў паліцэй-прэзыдыум, каб пратэставаць супроць пагрузкі ваеннага рыштунку для Японіі.

Начальнік паліцыі заявіў, што на падставе вэрсальскага дагавору паліцыя, нібы, ня мае права перашкаджаць гэтым ваенным пагрузкам. Дзякуючы пільнасьці рабочых выяўлены новыя ваенныя пастаўкі. Так, устаноўлена, што 1 лютага на сталелітэйны завод «Ганса» ў Любеке зьявіліся 6 японцаў і вялі перагаворы аб буйных ваенных заказах. У Нэймюнстэры, недалёка Гамбургу, усе тэкстыльныя фабрыкі ўжо некалькі тыдняў вырабляюць сукно ваеннага ўзору для Японіі. У Брэмэне 16 лютага па пароход пагружана 100 тон ваеннага рыштунку для Японіі. У Брэмэнскай гавані ўвесь час ідзе пагрузка параходаў ваенным рыштункам і выбуховымі матэрыямі для Далёкага Усходу.

Шьвэцкі пралетарыят пратэстуе

СТАКГОЛЬМ. 18. Учора адбыўся шматтысячны антываенны мітынг, арганізаваны кампартыяй. Паліцыя забараніла выступаць прадстаўніку кітайскіх рэвалюцыйных прадоўных. Аднак, прамова была сказана і бурна ўхвалена. Адмагалосна прынятая рэзалюцыя ганьбіць японскі імпэрыялізм і заклікае да абароны СССР.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Паведамленьні

— Парткалегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 27 лютага 1932 г., у 10 гадз. раніцы, у г. Жыткавічах (РКК) будзе працаваць выязная ПТ ЦКК па разглядзе парт. спраў паступных т. т.: Турэцкі С., Сяцэвіч Міфадзей Рыгораў, Гілавач Сьцяпан Паўлаў, Ярмаловіч Уладзімер Міколаў (Жыткавічы), Руды Янка Мікалаеў, Гелер Моталь Беркаў, Гіцальман Б. К., Казлоў Янка Савельеў (Турайск. раён). Яўка пералічаных т. т. абавязкова. Праезд за свой кошт.

— 21 лютага, у 7 гадз. веч., адбудзецца агульны адкрыты сход парткалектыву ВАН з пярэдкам дня: 1) Вынікі XVII партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)В і задачы ВАН (дакл. т. Панкевіч). 2) Розное.

— Менгарком КП(б)Б прапануе нізэйшаменаных т. т. зьявіцца да 25 лютага 1932 г., у пакой № 12: Алэксі П. Т., Абакун С. А., Андрэеў С. Н., Бруйпаў І. М., Баярскі І. У., Бамуцін І. Н., Вінер С. К., Вайнер Ц. Н., Вашкевіч Н. Н., Валюшын А. Р., Варабейчык М., Гутыі кіў Д. В., Ганцэр А. А., Давяк Р. К., віч Я. Р., Кудлач Я. П., Каганзкіпрэ Жыгамірскі Б. М., Зархін М. М., Залуцкі Б. М., Ігнатовіч Я. Р., Кудлач Я. П., Казак Я. В., Кісляў Г. А., Карэнка С. Т., Крылоў Л. З., Кароеін І. С., Косырэў М. І., Крыгасінскі Я. Я., Краўц М. К., Лядман М. З., Лыпанаў К. Ц., Міронаў Л. М., Марчанка Г. Я., Мазуркевіч Г. Т., Мінаеў С. С., Марчанка Ю. М., Нехайчык М. Г., Рудак А., Ратнер Б. І., Скітовіч З. М., Сурмач А. Ф., Стаповіс І. Ф., Саўковіч А. Е., Сьветлікаў Н. К., Суша С. А., Ціханаў І. А., Тайкевіч Ю. Н., Хамеленак Я. Я., Чадзеў П. І., Чаркасаў І. Н., Шарко С. Н., Янушка А. Ф., Велікола А. М. Яўка памянёных т. т. абавязкова.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б РАЗАМ З ПАЎПРЭДЗТВАМ РЭДАКЦЫІ „ПРАВДА" ПА БССР

Склікае агульна-гарадзкую нараду

ўпаўнаважаных па масавай рабоце з ЦО партыі „Правда" па пытаньнях:

а) разгортваньня масавай работы ў зьвязку з лімітаваным тыражу „Правды" (дакл. тав. Бабро(ускі);
б) аб дастаўцы „Правды" і яе выданьняў падпісчыкам (дакл. т. Краскоўскі);
в) інфармацыя з месц.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні гаркому, 3-ці паверх, зала пасяджэньняў, 21 лютага пачаткам в 6 гадз. вечара.

На нараду запрошаны навіны зьвяцца і ўпаўнаважаныя на партгрупу і цэхупаўнаважаныя.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

22 лютага, у 7 гадз. веч., у памяшканьні б. кіно „Культура"

Адбудзецца

ЎРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ МЕНГАРСАВЕТУ

з удзелам партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных, грамадзкіх арганізацый і вайсковых часьцей Менскага гарнізону, прысьвечанае XIV гадавіне Рабоча Селянскай Чырвонай арміі.

Члены і кандыдаты Менгарсавету, члены ЦК і ЦКК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ, СНК, ЦВК і ЦСПСБ, члены Гаркому і ГарКК КП(б)Б, Гаркому ЛКСМБ і ГСПС, чырвоныя партызаны і чырвонагвардэйцы праходзяць па сваіх мандатах.

Запрашальныя білеты прадпрыемствы і ўстановы атрымліваюць у Менгарпрафсавеце, а вайсковыя часьці—у Менгарсавеце.

Менгарсавет.

Беларускі Дзяржаўны Фінансава-эканамічны Інстытут

абвяшчае **ВЕСНАВЫ ПРЫЁМ**

на 1-шы курс (дзен. і вячэрн. групы) на адз.: фінансавае, прадпытнае і бухгатна-эканамічнае.

Тэрмін навучаньня 3 гады.

Фінансава-эканамічны інстытут рыхтуе высокакваліфікаваных спэцыялістаў эканамістаў-планавікоў у галіне фінансаў, прадпытку і эканамістаў-работнікаў бухгалтэрыі.

Фінансавае і бухгатнае адзяленьні рыхтуюць спэцыялістаў для ўсіх сыстэм народнай гаспадаркі: прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і тавараабароту і для ўсіх установаў і арганізацый.

Прадпытнае адзяленьне рыхтуе спэцыялістаў для ўсёй прадпытнай сыстэмы банкаў і аднаўчасе буйных рабочна-гарадзкіх цэнтраў.

Без іспытаў прымаюцца: асобы, скончыўшыя пасьля 1929 г. рабфакі, курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ, і ВТНУ, 3-гадові, ФЗН, прафшколы і агульна-адукацыйныя курсы на базе сямігодкі, тэхнікумы і іншыя роўныя ім навучальныя ўстановы. Іншыя асобы пашчыя трымаць іспыты ў абʼёме сярэдняй школы, згодна агульна-устаноўленых правіл па грамадазнаўстве, матэматыцы, фізыцы, прыродазнаўстве, беларускай і расійскай літаратуры.

Асобы, жадаючыя паступіць у інстытут, павінны падаць заявы з паказаньнем адзяленьня і прадмэтаў паступных дакумантаў: аб узросьце, аб адносінах да вайсковай павінасьці (копія вайсковага дакумэнту), аб адукацыі, аб стаце заробку, аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў; для калгасьнікаў—даведка калгасу, для адпрацоўнікаў—копія апошняга ліста на 1931 г., анкету, пасьведчаную прафсаюзнымі або сяльскімі арганізацыямі раёнага маштабу і тры фатаграфічныя карткі. Асобы, скончыўшыя тэхнікумы і прафшколы—даведку аб 2-гадовым практычным стажы.

Асобы, залічаныя студэнтамі інстытуту, забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам на правах ВТНУ (пастанова СНК СССР ад 28-XII — 1931 г. № 1183).

Заявы прымаюцца да 15 красавіка 1932 г. Заявы з дакумантамі накіроўваць заказным лістом на адрэс: гор. Менск, Савецкая вул., Унівэрсытэцкі Гарадок, гал. корпус, пакой 203, фінансава-эканамічнаму інстытуту.

Аб залічэньні і часе заняткаў будзе паведамлена кожнаму асобна.

ДЫРЭКЦЫЯ.

кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". ТОЛЬКІ 2 ДНІ 21 і 22-II.

Новы фільм вытворч. Саюзкіно

ГЕРОІ МАРХОТЫ

Рэж. Б. ШЭЛОНЦАЎ. Апаратары Лейбаў і Елізараў.

ШТОДЗЁННА 5 СЭАНСАЎ: ПАЧАТАК СЭАНСАЎ: дзёнк.—4-30, і — 6 —, II —7-30, III —9 —, IV —10-30

Наса — ад 1 г.

Дзеці ў кіно недапускаюцца.

„Інтэрнацыянал". Мастацкі бытавы фільм ХТО ВІНАВАТЫ

„ПРАЛЕТАРЫ" 3 нанядзы ў адзін сэанс 1) ЛУЧ Ў РАЮ ў 3 част. 2) ЧАРЛІ Ў ТЭАТРЫ ў 2 част. 3) ЛАСО ў 2-я частках.

„СПАРТАК". Пач.: 7, 9 і 11. 1) Хакасія ў 5 частках. 2) Бэтэр Кітон у карціне ТРЫ ЭПОХІ нанядзы ў 6 частках.

24 ЛЮТАГА Ў 6 ГАДЗІН ВЕЧАРА, ў гор. Віцебску, у памяшканьні Дому Прэсы адкрываецца

ПАШЫРАНАЕ АБʼЯДНАНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ

цэнтральнай (вышэйшай) і раённай конкурсных камісій па абмеркаваньню конкурсных навіны газэт сакрэтару, малагасаў ВГС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

На парадку дня—даклады аб рабоце на конкурсе:

а) раённых газэт—Віцебскай, Лепельскай, Гарадоцкай, Дрысенскай;
б) раённых конкурсных камісій—Бешанковіцкай, Чашніцкай, Суражскай, Сіроцінскай;
в) насьценных газэт 3 калгасаў, 2 саўгасаў, 1 школьнай, 2-х фабзавучэйскіх і 1 штодзённі, і 1 вайсковай насьценгазэты;
г) гарпрафсавету і Іфабзавучэю;
д) прэзыдыуму ГарМБТ.

Для ўдзелу ў пасяджэньні запрашаюцца партыйныя, прафсаюзныя, камсамольскі і калгасны актыў, рэдактары насьценгазэт і рабселькоры.

Цэнтральная конкурсная камісія пры „ЗЬВЯЗДЗЕ".

Х УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД САЮЗУ МЭДСАНПРАЦЫ

адкрываецца 1-га сакавіка 1932 г.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Даклад ЦК саюзу. 2) Справаздача ЦП саюзу і рэўкамісіі. 3) Даклад НК аховы здароўя—вынікі аховы здароўя за 1931 г., задачы 1932 г. і становішча падрыхтоўкі медперсаналу. 4) Выбары.

На зьезд вызначны прыбыць, акрамя выбраных дэлегатаў, усе члены і кандыдаты пленуму ЦП.

Кіраўніцтва ашчадкасамі і Дзяржкредыту БССР АБВЯШЧАЕ,

што з 25 па 26 лютага 1932 г. у п. Кандалакша (Карэльскае АССР) адбудзецца

5-ты тыраж выйгрышаў пазыкі „Пяцігодка—за 4 гады".

У тыражы прымаюць удзел усе абліґацыі пазыкі „Пяцігодка—за 4 гады" і „3-й пазыкі Індустрыялізацыі", за выключэньнем абліґацый гэтых пазык, якія раней ужо выйгралі.

Усяго ў гэтым тыражы па абодвух выпусках пазыкі будзе разыграна 244.470 выйгрышаў на суму 50.159.500 руб.

Афіцыйныя табліцы выйгрышаў будуць надрукаваны ў газэтах „Известия ЦИК СССР и ВЦИК", „Экономическая жизнь", „Крестьянская газета", „Красная Карелия" (Петрозаводск) и „Трудовые сбережения на соц. стройку".

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТАРФЯНЫ ТЭХНІКУМ

у складзе аддзяленьняў эксплёатацыі балот, мэханічнага і тэхналёгічнага абвяшчае набор на 7-мясячныя вячэрнія падрыхтоўчыя курсы (без адрыву ад вытворчасьці) да асеньняга набору 1932 г. На курсы прымаюцца рабочыя, калгаснікі і іх дзеці з асьветай ня ніжэй 5 груп сямігодкі, або з асьветай у роўным абʼёме і па ўзросьце да 19 год. Да заявы павінны быць прыкладзены анкета, заверанай па месцы працы і дакумэнты ў арыгіналах, згодна даведніка НКАсьветы БССР. Пачатак заняткаў 1-га сакавіка 1932 г. Слухачы курсаў стыпэндыяй і інтэрнатам не забясьпечваюцца. Заявы прымаюцца ў канцылярыі тарфянога тэхнікуму штодзённа ад 10 да 2 гадз. дня, Менск, Зьмяловскі зав. № 4.

Дырэкцыя.

ГАЛОЎДАРТРАНС БССР

даводзіць да ведама ўсіх гаспадарчых арганізацый БССР, якія патрэбны шофэры, што іх неабходна зьвярнуцца ў Лутадор (Менск, Савецкая, 62) і

ЗАКЛЮЧЫЦЬ УМОВУ НА ПАДРЫХТОЎКУ ШОФЭРАЎ

Тых арганізацый, якія ня зробяць заявак ДА 25-2-32 г., страцяць права на пазачарговае прэтэнзіі у забясьпечэньні іх шофэрамі.

Сэктар кадраў і падрыхтоўкі ГАТ

Друкарні газ. „Зьвязда"

ПАТРЭБЕН ВОПЫТНЫ БУХГАЛЬТАР,

Зварачацца Менск, Савецкая,